Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 129 (4033)
СУБОТА, 16 МАЯ
1931 г.
Кошт нумару 5 коп.
Выходзіць
БЕСЬПЕРАПЫННА

Выканаць і перавыканаць плян сяўбы

З пасеўнага фронту паступаюць ТРЫВОЖНЫЯ весткі. Масавая сяўба, асабліва па індывідуальным сэктары, разгортваецца недапушчальна СЛАБА. СЁНЕШНІЯ тэмпы сяўбы НЕ ДАЮЦЬ ніякай гарантыі ў тым, што пасеўны плян будзе выканан своячасова. Вынікі першай дэкады мая — яркае таму пацьвярджэньне.

За мінулыя 10 дзён засеяна толькі 95.445 гэкт. — 3,6 проц. пляну. Саўгасы да 10-га мая засеялі 5.814 гэкт., што складае 5,3 проц. пляну. Адстаюць калгасы, якія засеялі ўсяго 37.265 га — 4,5 проц. іх пляну. Па індывідуальным сэктары плян сяўбы выканан толькі ў разьмеры 3 проц. Ня варта паўтараць, што такое становішча зьяўляецца ЗУСІМ НЕЦЯРПІМЫМ. Яно павінна быць ліквідавана. Мы абавязаны рашуча ВЫРАЎНЯЦЬ пасеўны фронт, бо 20 мая — кантрольны тэрмін сяўбы.

Прывесьці ў рух усе вагары сяўбы — баявая і асноўная задача. Зьдзельшчына, неадкладнае выкараненьне абязьлічкі і кантрактацыя яравых пасеваў — МАГУТНЫЯ РУХАВІКІ ДРУГОЙ БАЛЬШАВІЦКАЙ СЯЎБЫ. Гэтыя рухавікі яшчэ НЕ запрацавалі поўным ходам.

Правільная расстаноўка сіл на палявых работах НЕ ЗАБЯСЬПЕЧАНА. Невыстарчальная арганізацыя працы — адна з галоўных прычын зусім слабых тэмпаў сяўбы. Карэньні такога становішча хаваюцца ў тым, што пераход у калгасах на зьдзельшчыну, ацэненую ў працаднёх, і да гэтага часу ДАЛЁКА НЯ СКОНЧАН. Усе тэрміны даўно мінулі. Аднак, значная частка калгасаў выйшла на палявыя работы, НЕ ПЕРАЙШОЎШЫ НА ЗЬДЗЕЛЬШЧЫНУ З УЛІКАМ У ПРАЦАДНЁХ. Камісія выкананьня пры СНК БССР з усёй сілай канстатавала, што дырэктывы аб пераходзе на зьдзельшчыну НЕ АЖЫЦЬЦЁЎЛЕНЫ. Прыблізна 30 проц. калгасаў на зьдзельшчыну яшчэ не перайшлі. Гэты зусім нецярпімы прарыў яшчэ больш паглыбляецца тым, што ў цэлым радзе калгасаў пераход на зьдзельшчыну адбыўся ФАРМАЛЬНА. Ва многіх калгасах, якія афіцыяльна перайшлі на зьдзельшчыну, ігнаруюць і ня выконваюць ня асноўныя прынцыпы. ДАКЛАДНЫ ПАДЛІК РАБОТЫ У ПРАЦАДНЁХ НЕ НАЛАДЖВАЕЦЦА. У НОРМАХ ВЫПРАЦОЎКІ ПАНУЕ БЛЫТАНІНА. Іншымі словамі ў частцы калгасаў НА ПАПЕРЫ ІСНУЕ ЗЬДЗЕЛЬШЧЫНА, А НА СПРАВЕ — ПАДПРАЎЛЕНАЯ ПАДЗЁНШЧЫНА. Такая ПАПЯРОВАЯ зьдзельшчына толькі стварае глебу для антыкалгаснай, кулацкай агітацыі. Яна балюча б'е па разгортваньні сяўбы і тармозіць арганізацыйна-гаспадарчае замацаваньне многіх калгасаў.

Гэтаму трэба пакласьці канец. ТРЭБА СУРОВА ЗМАГАЦЦА З УСЯКІМІ ПРАЯЎЛЕНЬНЯМІ ФАРМАЛІЗМУ І КАЗЁНШЧЫНЫ ПРЫ ПЕРАХОДЗЕ КАЛГАСАЎ НА ЗЬДЗЕЛЬШЧЫНУ. ПАПЯРОВАЯ ЗЬДЗЕЛЬШЧЫНА ПАВІННА БЫЦЬ З КОРАНЕМ ВЫРВАНА. Падзёншчыну ў калгасах, пад якой-бы яна шыльдай не хавалася, ТРЭБА ЗЬНІШЧЫЦЬ. Галоўнае зараз — неадкладна нападзіць выразны ўлік работы ў працаднёх і вызначыць цьвёрдыя нормы выпрацоўкі. Курс трэба ўзяць на перадавіковую калгасную будоўлі — ударнікаў. Сярэдняя нормы ўдарнікаў, якія сапраўды паказваюць узоры камуністычных адносін да працы, павінны быць пакладзены ў аснову. Нельга вызначаць штучна і беспадстаўна павялічаныя, раздутыя нормы выпрацоўкі. Нельга ісьці і па лініі найменшага супраціўленьня, на якую кулак дапеў штурхнуць кіраўніцтва пасобных калгасаў, — прымаць яўна невыстарчальныя, зьменшаныя нормы.

Апошні тэрмін пераходу на зьдзельшчыну — 25 мая. Апартуністычныя перашкоды на шляху зьдзельшчыны павінны быць неадкладна зруйнаваны. Вымятаючы прэч з калгасаў папяровую зьдзельшчыну, трэба дабіцца, каб кожны калгас, павышаючы тэмпы сяўбы, зараз-жа перайшоў на зьдзельную работу з цьвёрдым і выразным улікам у працаднёх. Бяз гэтага посьпех пасеўнай кампаніі забясьпечан ня будзе. На раённыя партыйныя арганізацыі, на калгасна-каапэрацыйную сыстэму ускладаецца найвялікшая адказнасьць. Правапартуністычная бязьдзейнасьць у правядзеньні зьдзельшчыны павінна быць рашуча і неадкладна спынена.

АБЯЗЬЛІЧКА яшчэ пануе і ў калгасах, і ў саўгасах, і ў МТС. Гэта непасрэдна адбіваецца на ходзе сяўбы. Абязьлічка ў адносінах выкарыстаньня с.-г. машын значна тармозіць тэмп палявых работ і прыводзіць да зусім невыстарчальнага выкарыстаньня трактарнага парку. Трэба раз назаўсёды выкараніць абязьлічку з саўгасаў, калгасаў і МТС. Да кожнага калгаснага каня, да кожнай с.-г. машыны павінны быць прымацаваны для пастаяннай работы на час сяўбы пэўныя калгаснікі. Кожны трактарыст у паасобку павінен несьці адказнасьць за свой трактар.

Праваапартуністычная практыка СКАРАЧЭНЬНЯ пасеўнай плошчы і да гэтага часу поўнасьцю ня ліквідавана. Зноў маюць месца права-апартуністычныя спробы пасобных арганізацый і калгасаў скараціць пасеўную плошчу. «Зьвязда» за апошнія дні падала нямалафактаў, калі некаторыя раёны скарачаюць плошчу яравых пасеваў, асабліва па тэхнічных і сіласных культурах. Усякая спроба скараціць пасеўную плошчу ёсьць простая дапамога кулаку. Аматараў скарачэньня пасеўных плянаў трэба бязьлітасна выкрываць, як правых апартуністаў, як пёкаляў кулака. Сорам і ганьба такім раёнам, як Жлобінскі, дзе мясцовыя апартуністы скарачаюць пасеўную плошчу тэхнічных культур. І ня толькі выкрываць, трэба караць, караць бяз усякай літасьці ўсіх непасрэдных арганізатараў скарачэньня пасеўных плянаў.

У бягучую вясну мы абавязаны значна ПАШЫРЫЦЬ пасеўную плошчу пад ТЭХНІЧНЫМІ КУЛЬТУРАМІ. Наша баявая задача — засеяць ня менш 240 тысяч гэктараў ільну і 40 тысяч гэкт. канапель. Зусім відавочна таму, якую вялізарную ўвагу трэба аддаць сяўбе тэхнічных культур. Партыйныя арганізацыі ільнаводчых раёнаў павінны мабілізаваць усю сваю энэргію, кінуць усе свае сілы на барацьбу за бальшавіцкае правядзеньне пасеву тэхнічных культур. Спробы кулака і яго права-«левых» агентаў сарваць пасеў тэхнічных культур павінны атрымаць самы суровы і руйнуючы адпор. Усякае найменшае імкненьне зьменшыць плошчу пад пасевамі ільну і канапель, усякая маруднасьць і бязьдзейнасьць у засеве тэхнічных культур толькі дапамагаюць кулацтву ў яго шкодным антыкалгаснай рабоце. Наш пёзунг, наша задача ўзьняць хвалю сацыялістычнага спаборніцтва ў ільнаводчых саўгасах і калгасах, арганізаваць сустрэчныя пасеўныя пляны, каб ня толькі выканаць, але і ПЕРАВЫКАНАЦЬ праграму сяўбы па тэхнічных культурах.

МАШЫНА-ТРАКТАРНЫЯ СТАНЦЫІ павінны ісьці ў авангардзе сяўбы. Гэтага ў сапраўднасьці яшчэ няма. МТС недапушчальна адстаюць у правядзеньні веснавой сяўбы. За першую дэкаду мая машына-трактарныя станцыі засеялі ўсяго толькі 3.913 гэкт. Гэта складае... 1,9 проц. пляну сяўбы па МТС. Недапушчальна-агідны факт. Прычыны такога ганебнага адставаньня заключаюцца ў тым, што ў цэлым радзе МТС не ліквідавана абязьлічка і ня ўведзена зьдзельшчына. Трактарны парк выкарыстоўваецца яшчэ з далёка няпоўнай нагрузкай. Зарэгістраваны факты, калі трактары на палявых работах працуюць значна менш 21 гадзіны. Так далей быць ня можа. Пераход на зьдзельшчыну і ліквідацыю абязьлічкі павінны быць зараз-жа ажыцьцёўлены ў кожнай машына-трактарнай станцыі. Ня меншае значэньне набывае і пераход МТС на ГАСПАДАРЧЫ РАЗРАХУНАК. Трэба падхапіць дасканалую ініцыятыву ўдарнікаў КОЙДАНАЎСКАЙ МТС, якія абавязаліся забясьпечыць нагрузку кожнага трактара па 23 гадзіны ў суткі. Прыклад Койданаўскай машына-трактарнай станцыі трэба перанесьці ва ўсе МТС. Машына-трактарныя станцыі абавязаны ня толькі ў самыя бліжэйшыя дні крута ўзьняць тэмпы веснавой сяўбы.

Сяўбу МТС павінны арганічна злучыць з самай упартай і настойлівай барацьбой за арганізацыю НОВАГА КАЛГАСНАГА ПРЫЛІВУ. Трэба з усёй рашучасьцю вярнуць, што да сёньняшняга дня нашы МТС нездавальняюча выконваюць сваю ролю рухавікоў калгаснага прыліву. Указаньне красавіцкага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б аб тым, што МТС невыстарчальна арганізуюць новы калгасны прыліў, і па гэты час захоўвае ўсю сваю моц. Рашучы і карэнны пералом у арганізацыі новага калгаснага прыліву павінен быць забясьпечан. МТС абавязаны гэта зрабіць.

ВЕСНАВАЯ СЯЎБА І БАРАЦЬБА ЗА НОВЫ КАЛГАСНЫ ПРЫЛІЎ — АДНО НЕПАРУШНАЕ ЦЭЛАЕ. Максымум увагі АРГАНІЗАЦЫЯНА-ГАСПАДАРЧАМУ ЗАМАЦАВАНЬНЮ новых с.-г. арцеляй. На гэтым важнейшым вучастку яшчэ ня зьнішчаны сур'ёзныя прарывы. Нельга ні ў якім разе лічыць здавальняючымі тэмпы аграмаджаньня цягавай сілы і іншых асноўных сродкаў вытворчасьці ў калгасах. Барацьба ЗА КАЛГАСНАГА КАНЯ ў пераважнай большасьці раёнаў не разгорнута. Не даецца адпор у цэлым радзе месц падрыўной дзейнасьці кулака. З гэтым трэба пакончыць. Неабходна разгарнуць найшырэйшую масавую работу за хутчэйшае аграмаджаньне цягавай сілы ў калгасах. Раённыя арганізацыі абавязаны забясьпечыць у МАКСЫМАЛЬНА КАРОТКІ ТЭРМІН АФАРМЛЕНЬНЕ новаарганізаваных калгасаў.

Зусім МАРУДНЫЯ тэмпы КАНТРАКТАЦЫІ ЯРАВЫХ пасеваў зьяўляюцца адным з сур'ёзных тормазаў у правядзеньні веснавой сяўбы. Даўно, даўно мінулі апошнія тэрміны кантрактацыі яравых. Аднак, плян і па сёньняшні дзень яшчэ ня выканан. Апошняя зводка Наркамснабу паказвае, што і зараз баявыя тэмпы ў кантрактацыі яравых ня ўзяты. На 11 мая плян кантрактацыі яравых пасеваў выканан усяго толькі на 84,8 проц. Ганебна слаба праходзіць кантрактацыя збожжавых, па лініі якіх плян выканан усяго на 82,3 проц. Баявая дырэктыва партыі і ўраду — скончыць кантрактацыю тэхнічных культур да 5 мая — сарвана. Па ільне плян кантрактацыі выканан усяго на 76,7 проц. ТРЭБА НЕАДКЛАДНА ПАКОНЧЫЦЬ З ТАКІМ СТАНОВІШЧАМ. БЛІЖЭЙШЫЯ ДНІ ПАВІННЫ СТАЦЬ ДНЯМІ ПОЎНАГА ЗАВЯРШЭНЬНЯ ЎСІХ РАБОТ ПА КАНТРАКТАЦЫІ ЯРАВЫХ ПАСЕВАЎ.

Многія калгасы распачалі палявыя работы, не стварыўшы БРАНІЯВАНЫХ КАРМОВЫХ ФОНДАЎ і не падрыхтаваўшы поўнасьцю насеннага матар'ялу. Кармовыя і насенныя фонды павінны быць поўнасьцю сабраны. НА-ХАДУ СЯЎБЫ трэба забясьпечыць неадкладнае скончэньне поўнага збору насенных і кармовых фондаў.

Раённыя арганізацыі ўсё яшчэ не зварачаюць амаль ніякай увагі на правядзеньне веснавой сяўбы ў ІНДЫВІДУАЛЬНЫМ сэктары. Аб гэтым небезпечна сьведчыць зусім недапушчальнае адставаньне аднаасобных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак з разгортваньнем пасеўнай кампаніі. Трэба неадкладна разгарнуць сярод аднаасобнікаў найшырэйшую масавую работу з тым, каб узняць сярод іх хвалю спаборніцтва і ўдарніцтва, каб узмацніць тэмпы сяўбы па індывідуальным сэктары, дабіцца, каб новыя аднаасобныя бядняцка-серадняцкія масы правялі веснавую сяўбу калектыўна.

Кулак шапёка прабуе дэзарганізаваць пасеўны фронт. Кулак накіроўвае ўсе свае намаганьні на падрыў зьдзельшчыны, на тармажэньне кантрактацыі яравых пасеваў, на зрыў новага калгаснага прыліву. У гатай яго шкодніцкай рабоце кулаку добрасумленна дапамагаюць правыя і «левыя» апартуністы. Барацьба з кулакам, з яго правымі і «левымі» агентамі павінна быць рашуча ўзмоцнена. Гэта асноўная ўмова посьпеху другой бальшавіцкай сяўбы.

Завяршыць у маі ўсе палявыя работы — задача, на якой будзе праверана БАЯЗДОЛЬНАСЬЦЬ КОЖНАЙ ПАРТЫЙНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ, яе ўменьне пабальшавіцку мабілізаваць масы на выкананьне дырэктыў партыі і ўраду. ТРЭБА ДАРАЖЫЦЬ КОЖНЫМ ДНЁМ, КОЖНАЙ ГАДЗІНАЙ, КОЖНАЙ ХВІЛІНАЙ. Дапойная павольнасьць — злачынства. У нашым распараджэньні ёсьць усе рашаючыя магчымасьці для таго, каб У ТЭРМІН закончыць веснавую сяўбу. Надвор'е ня нельга лепш спрыяе пасеўнай кампаніі. Гэты немалаважны фактар сяўбы трэба поўнасьцю выкарыстаць для максымальнага фарсаваньня палявых работ.

Абвешчаны Цэнтральным Камітэтам КП(б)Б КОНКУРС НА ЛЕПШАЕ ПРАВЯДЗЕНЬНЕ веснавой сяўбы павінен ахапіць усе раёны, усе саўгасы і МТС, усе калгасы. Партыйныя арганізацыі павінны ўзьняць калгасныя масы на барацьбу за першынства. Цэнтральная мэта конкурсу — ня толькі выканаць, АЛЕ І ПЕРАВЫКАНАЦЬ ПЛЯН СЯЎБЫ. За гэта павінны самаддана і ўпарта змагацца саўгасы, калгасы, МТС. Перавысіць плян сяўбы ва што-б там ні стала — вось шлях, які вядзе да поўнай перамогі. Вышэй тэмпы сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарнага руху! Вышэй хвалю арганізацыі сустрачных плянаў, якія прадугледжваюць ПАВЯЛІЧЭНЬНЕ пасеўнай плошчы! З бальшавіцкай энэргіяй, з бальшавіцкай упартасьцю на фронт сяўбы для барацьбы за ПЕРАВЫКАНАНЬНЕ праграмы веснавой пасеўнай кампаніі.

Фашысцкія бандыты гуляюць з агнём

Правакацыйная антысавецкая кампанія ў Фінляндыі ня спыняецца

ЛІХАМАНКАВАЯ ПАДРЫХТОЎКА ФАШЫСТАЎ ДА ВАЙНЫ

ГЭЛЬСІНГФОРС, 2. Адначасова з антысавецкай кампаніяй у Фінляндыі праводзіцца ЛІХАМАНКАВАЯ ВАЕННАЯ ПАДРЫХТОЎКА. Згодна паведамленьня газэт, так званая «Фінляндзкая арганізацыя процігазавай абароны», якая налічвае 14.000 членаў, прыступіла да правядзеньня масавай ваеннай прапаганды сярод насельніцтва. Па патрабаваньні гэтай арганізацыі 18 ГЭЛЬСІНГФОРСКІХ АКЦЫЯНЭРНЫХ ТАВАРЫСТВАЎ АБАВЯЗАЛІСЯ ПАБУДАВАЦЬ НА СВАІХ ВУЧАСТКАХ ГАЗАСХОВЫ. У сучасны момант у Гэльсінгфорсе ўжо ПРЫСТУПЛЕНА ДА ПАБУДОВЫ АДНЭЙ ВЯЛІКАЙ ГАЗАСХОВЫ. Многія ўстановы набылі вялікія партыі процігазаў для сваіх служачых. Шуцкор (фашысцкая ваенная арганізацыя) таксама павялічыў у сувязі з антысавецкай кампаніяй сваю мілітарызацыю дзейнасьць. У веданьне Шуцкора перадаецца БЕРАГАВАЯ АРТЫЛЕРЫЯ — адзін з найбольш адказных вучасткаў у выпадку вайны. Апрача гэтага Шуцкор атрымаў ад гэльсінгфорскага муніцыпалітэту новыя дадатковыя асыгнаваньні ў разьмеры 250.000 МАРАК НА ПАБУДОВУ ПРАЦІЗАРАПЛЯННЫХ БАТАРЭЙ. З Швэцыі ўсё прыбываюць у Фінляндыю новыя партыі ваенных самалётаў. Гэтымі днямі чакаецца спуск новай падводнай лодкі для фінляндзкага ваеннага флёту. Тэрмінова вядуцца работы на пабудове новага крэйсэра. Намячаецца павялічэньне кананэрнага флёту. (ТАСС).

* * *

Ад антысавецкай кампаніі пад лёзунгамі барацьбы супроць «камуністычнай небясьпекі», ад разгрому па ўсёй краіне левых рабочых арганізацый і перакідваньня на савецкую тэрыторыю дзесяткаў рэвалюцыйных рабочых і левых дэпутатаў фінскага сойму, ад разгрому магазынаў, гандлюючых савецкімі таварамі, — фінляндзкі фашызм пераходзіць ДА АДКРЫТАГА ПРАВАКАВАНЬНЯ ВАЙНЫ СУПРОЦЬ САВЕЦКАГА САЮЗУ. Толькі пару дзён таму назад у савецкім друку паведамлялася ўжо аб антысавецкай дэманстрацыі, якая была нападжана фашыстамі З ВЕДАМА І ПРЫ ПАДТРЫМАНЬНІ ЎРАДУ перад будынкам савецкага паўпрэдзтва ў Гэльсінгфорсе. Характэрна, што паліцыя спакойна стаяла ў баку і наглядала, як адбывалася гэта антысавецкая дэманстрацыя. Сёньнешнія тэлеграмы выразна ўжо гавораць, што ФІН�ЛЯНДЗКІ ФАШЫЗМ, АДНАЧАСОВА З АГАЛЦЕЛАЙ АНТЫСАВЕЦКАЙ КАМПАНІЯЙ АДКРЫТА, ЛІХАМАНКАВЫМІ ТЭМПАМІ РЫХТУЕЦЦА ДА ЎЗБРОЕНАГА НАПАДУ НА СССР.

Посьпехі нашай пяцігодкі, асабліва посьпехі калектывізацыі сельскай гаспадаркі не на жарты ўстрывожылі сусьветных драпежнікаў. Імпэрыялісты зараз імкнуцца ўсімі сіламі справакаваць СССР на вайну, каб, такім чынам, сарваць нашу пяцігодку, і, калі ўдасцца, за кошт СССР выйсьці з эканамічнага крызісу. І вось, францускі генштаб і яго васал—фашысцкая Польшча, якая мае асабліва значны ўплыў на фінляндзкіх фашыстаў, штурхаюць Фінляндыю на правакаваньне антысавецкіх авантур.

13 мая паўпрэд у Фінляндыі тав. МАЙСКІ ЗАЯВІЎ РАШУЧЫ ПРАТЭСТ СУПРОЦЬ НАГЛЫХ ПРАВАКАЦЫЙ ФІНЛЯНДЗКІХ ФАШЫСТАЎ, за сьпіною якіх стаіць фінляндзкі ўрад, і ЎСЮ АДКАЗНАСЬЦЬ ЗА ВЫНІКІ, якія могуць узьнікнуць, УСКЛАЎ НА ФІНЛЯНДЗКІ ЎРАД. Савецкі Саюз, які заняты сацбудаўніцтвам, вайны ня хоча, але не дазволіць правакаваць сябе і на правакацыі фашыстаў, за сьпінамі якіх стаяць імпэрыялісты, зможа знайсьці меры, каб ацьвярэзіць абнаглеўшых разбойнікаў.

Цэнтральныя і раённыя газэты

20 мая пачынаецца месячнік пралетарскага друку

АДКАЗВАЮЦЬ НА ВЫКЛІК МЕНСКІХ УДАРНІКАЎ ДРУКУ КАНКРЭТНЫМІ САМААБАВЯЗАЦЕЛЬСТВАМІ

Ніводнай газэты,

якая-б не ўзяла на сябе самаабавязацельстваў

Ліст перадавых барацьбітоў сацыялістычнага будаўніцтва — менскіх ударнікаў друку сустрэў жывы водгук з боку ўсіх цэнтральных і раду гарадзкіх і раённых газэт.

Зводка, якая сёньня зьмяшчаецца ў «Зьвязьдзе» з паказаньнем тых канкрэтных самаабавязацельстваў, якія ўзялі на сябе рад газэт, сьведчыць аб тым, што барацьба за ажыцьцяўленьне друку, якія (прапановы) зьяўляюцца сустаўной часткай ажыцьцяўленьня пастаноў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б па пытаньнях рабселькораўскага руху, разгортваецца ўсё шырэй і шырэй.

Побач з гэтым, нельга не адзначыць таго, што на заклік ударнікаў друку не адгукнуліся: газэты «Віцебскі пралетарыі», «Рэчыцкая праўда» і інш., а таксама часопісі.

У бліжэйшыя дні трэба дабіцца таго, каб у адказ на ліст ударнікаў друку ўзялі на сябе канкрэтныя самаабавязацельствы і выконвалі іх усе абсалютна газэты і часопісі, **пачынаючы ад цэнтральных і канчаючы насьценнымі.**

Партарганізацыі павінны ўзмацніць непасрэднае штодзённае кіраўніцтва падрыхтоўкай і правядзеньнем месячніка друку і беларускага зьезду рабселькораў.

Разгортваецца спаборніцтва паміж газэтамі

Наступныя газэты выклікалі на сацыялістычнае спаборніцтва па лепшым выкананьні дырэктыў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б па перабудове рабселькораўскага руху, па падрыхтоўцы кадраў для раённага, сельскага і нізавога друку і па рэалізацыі прапаноў менскіх ударнікаў друку:

Газэта «РАБСЕЛЬКОР» — газэту ўдарных брыгад друку і рабселькораў-ударнікаў Паўночна-Каўказкага краю «МАСАВІК».

Газэта «РАБОЧИЙ» — усеукраінскую рабочую газэту «ПРАЛЕТАРЫ», «САВЕЦКУЮ БЕЛАРУСЬ», «КАЛГАСЬНІК БЕЛАРУСІ», «ОРКУ», «ПАЛЕСКУЮ ПРАЎДУ», «АКЦЯБР», ВІЦЕБСКІ ПРАЛЕТАРЫ».

Газэта «СЕЛЬГАСРАБОЧЫ» — украінскую газэту «СІЛЬСКО-ГОСПОДАРСЬКІ ПРОЛЕТАР».

«ПАЛЕСКАЯ ПРАЎДА» — усе цэнтральныя і раённыя газэты на сустрэчныя павялічаныя самаабавязацельствы.

Першая зводка водгуку газэт

на ліст ударнікаў друку

«Зьвязда» ў парадку самаабавязацельства ўзяла на сябе абавязак арганізаваць газэту-школу і ўзяць шэфства над дзьвюма раённымі газэтамі.

«Рабселькор» — да 20-годзьдзя «Праўды» падрыхтаваць 5 кіруючых работнікаў для раённага і нізавога друку; арганізаваць сыстэматычную перападрыхтоўку работнікаў раённых газэт — кіраўнікоў сэктарамі ўдарных брыгад друку і рабселькораў.

«Рабочий» — у дзесяцідзённы тэрмін арганізаваць школу-семінары для 30 ударнікаў друку, з якіх падрыхтаваць групу адказных работнікаў для нізавых газэт; дапамагаць добрускай газэце **«Чырвоная бракамолка»** ў яе рабоце па мабілізацыі рабочых мас на выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну, для чаго камандзіраваць у Добруш у дапамогу рэдкалегіі работніка рэдакцыі.

«Чырвоная Зьмена» — да 1-га жніўня падрыхтаваць аднаго рэдактара раённай газэты; на працягу месяца завербаваць 500 новых юнкораў-ударнікаў і скласьці 150 новых ударных брыгад друку на асобных пытаньнях; да 1-га чэрвеня сумесна з ЦК ЛКСМБ скончыць вылучэньне 50 камсамольцаў-актывістаў на работу ў раённыя газэты.

«Савецкая Беларусь» — арганізаваць пры рэдакцыі сэмінары для рабкораў-ударнікаў; практычна дапамагчы ў рабоце 12 шматтыражкам МТС.

«Орка» — арганізаваць вызыны сэмінары-курсы для сельскораў; замацаваць работу ўжо арганізаваных дзьвёх шкляграфічных газэт — У калгасе імя Дзяржынскага (Любавінскі сельсавет, Буда-Кашалёўскага раёну, і ў Замастоцкім сельсавеце (Сьмілавіцкі раён); узяць шэфства над 2-ма раённымі газэтамі, у якіх будуць друкавацца польскія старонкі; падрыхтаваць трох работнікаў для работы ў польскіх старонках раённых газэт.

«Калгасьнік Беларусі» — арганізаваць пасты «Калгасьніка Беларусі» ў кожным калгасе, саўгасе і МТС; правесьці заклік ударнікаў саўгасаў, калгасаў і МТС у рады рабселькораў-ударнікаў і ўдарных брыгад друку; арганізаваць сетку вызных школ-семінараў для падрыхтоўкі з рабселькораў-ударнікаў работнікаў нізавога друку; арганізаваць шматтыражкі і насьценгазэты ў буйных саўгасах, калгасах, МТС і населеных пунктах пры ўмове забясьпячэньня іх партыйным кіраўніцтвам.

«Сельгасрабочы Беларусі» — наладзіць кансультацыю для рэдактароў і членаў рэдкалегій саўгасных насьценгазэт і рабкораў, пры кожны саўгасе арганізаваць насьценгазэту; пры кожным саўгасе і МТС арганізаваць пасты «Сельгасрабочы Беларусі»; правесьці куставыя сэмінары для рабселькораў і членаў рэдкалегій насьценгазэт на саўгасах і МТС, на час пасеўнай і ўборачнай кампаніі арганізаваць «сквозной» рабселькораўскі буксір.

«Піянэр Беларусі» — правесьці сходы і мітынгі з рабочымі і калгаснікамі і канфэрэнцыі піянэраў-ударнікаў і дзяткораў па растлумачэньні сутнасьці прапаноў менскіх ударнікаў друку і задач перабудовы рабселькораўскага руху; шырока расказаць аб гэтым усім дзецям працоўных; дабіцца ў выніку гэтай работы прыліву соцень новых дзяткораў, паляпшэньня кіраўніцтва і якасьці насьценгазэт і павялічэньня падпіскі на камуністычны друк.

«Палеская праўда» ўзяла на сябе адказнасьць за арганізацыю супольна з кіраўніцтвам усебеларускай саўпартшколы новага газэтнага аддзяленьня пры саўпартшколе. Арганізаваць газэтную практыку для 30 курсантаў газэтнага аддзяленьня саўпартшколы, курсы па перападрыхтоўцы рэдактароў калгасных і саўгасных насьценгазэт на 20 чал. і насьценгазэт, прадпрыемстваў на 30 чал. Арганізаваць практыку рэдактароў буйнейшых насьценгазэт гораду і вёскі пры рэдакцыі для павышэньня іх кваліфікацыі. Устанавіць калектыўную распрацоўку вузлавых пытаньняў палітыкі партыі ў разрэзе апэрацыйных задач друку і рабселькораў, для чаго праводзіць аб'яднаныя вытворчыя нарады работнікаў рэдакцый разам з работнікамі заводзкіх і цэхавых газэт. У выкананьне дырэктыў ЦК УсеКП(б) аб дыферэнцыяцыі кіраўніцтва рабселькораўскім рухам узяць на сябе абавязак — распрацоўку спэцыфікі работы нізавога друку і рабкораў у мэталаапрацоўчай прамысловасьці. Арганізаваць на старонках «Палеская праўды» сыстэматычныя агляды шматтыражак і насьценгазэт, даючы іх ня менш 15 у месяц.

«Камунар Магілеўшчыны» — арганізаваць вячэрнія курсы для рабселькораў на 20 гадзін.

«Бальшавік Барысаўшчыны» —узяць шэфства над дзьвюма шматтыражкамі і дзьвюма насьценгазэтамі; у кожным прадпрыемстве і калгасе разгарнуць работу па арганізацыі ўдарных брыгад друку; правесьці кампанію па адпрацоўцы некалькіх гадзін у фонд пралетарскай дапамогі нізавому друку.

Адказ студэнтаў газэтнага аддзяленьня

У парыяд разгорнутага сацыялістычнага наступленьня па ўсім фронце і магутнага ўздыму творчай актыўнасьці рабочай клясы і шырокіх колаў калгасных і бядняцка-серадняцкіх мас сяляцтва, усё вышэй узьнімаецца роля рабселькораўскага руху, як руху актыўных байцоў за генэральную лінію партыі. Рабселькоры становяцца перадавымі ўдарнікамі ў барацьбе за прамфінплян і калгасна-саўгаснае будаўніцтва, зьяўляюцца «камандзірамі пралетарска-грамадзкай думкі, якія стараюцца накіраваць невычарпальныя сілы гэтага вялізарнейшага фактару па дапамогу партыі і савецкай уладзе ў цяжкой справе сацыялістычнага будаўніцтва».

Мы, студэнты газэтнага аддзяленьня камвузу імя Леніна, ад'яжджаючы на двухтыднёвую практычную работу ў раёны БССР, каб дапамагчы калгасам і саўгасам у справе пераходу на зьдзельшчыну, лепшай арганізацыі працы і выразнай пастаноўкі ўліку працы — абвяшчаем сябе ўдарнікамі і ў сувязі з месячнікам друку бярэм на сябе наступныя канкрэтныя абавязкі:

1. Дапамагчы выканаць пастанову ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб зарэньні ў кожным калгасе, саўгасе, МТС і населеным пункце газэты.

2. Дапамагчы перабудаваць рабселькораўскія рады ў адпаведнасьці з пастановамі ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б, зрабіўшы ўдарную рабселькораўскую брыгаду вядучым зьвяном рабселькораўскага руху, а таксама разгарнуць падрыхтоўку да месячніку друку і ўсебеларускага зьезду рабселькораў.

3. Дапамагчы шматтыражкам, насьценгазэтам па-бальшавіцку мабілізаваць і арганізаваць масы на ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі па разгортваньні калгаснага руху і яго замацаваньня.

УДАРНАЯ БРЫГАДА: КАЗЛОЎ, СУДЗЬБІН, БАРАНОЎСКІ, РУБІН, САДОЎСКІ, ШЭПЕЛЕЎ, САВІН, ГРЫНГЛАЗ, ГЯРДОВІЧ, СЯМЁНАЎ, КАШЫРЫН, ІОФЭ, ПЫКО, ЛІВЕРЦ, АСТАШКЕВІЧ, ШЫЛЯНКОЎ.

У абозе

Ня гледзячы на выключна вялікае палітычнае значэньне, якое маюць 15 прапаноў менскіх ударнікаў друку, яшчэ далёка ня ўвесь раённы друк Беларусі адгукнуўся на іх.

Вось тыя газэты, якія не падхапілі выкліку ўдарнікаў друку і не ўзялі на сябе канкрэтных самаабавязацельстваў: «ВІЦЕБСКІ ПРАЛЕТАРЫ», «ЧЫРВОНАЯ ПОЛАЧЧЫНА», «КАЛГАСЬНІК МЗІЗЫРШЧЫНЫ», «РЭЧЫЦКАЯ ПРАЎДА», «КАЛГАСЬНІК НА ВАРЦЕ», «МАЯК КАМУНЫ», «КАМУНІСТ», «ЛЕНІНСКІ ПРЫЗЫЎ», «УДАРНІК КОЙДАНАЎШЧЫНЫ» і «РАЎДАНАСІС АРТОЯС».

Апрача таго, НІ АДНА ЧАСОПІСЬ ня выступіла на старонках цэнтральнага друку з канкрэтнымі самаабавязацельствамі ў адказ менскім ударнікам друку.

Першы зьезд камсамолу Заходняй Беларусі

У красавіку 1931 году адбыўся першы зьезд рэвалюцыйнага авангарду працоўнай моладзі Зах. Беларусі — камсамолу. Гэты зьезд у гісторыі рэвалюцыйнага руху моладзі, у гісторыі барацьбы камсамолу мае найвялікшае значэньне.

Камсамол Зах. Беларусі не пачынае свайго існаваньня з 1-га зьезду. Ён існуе і вядзе ўпартую барацьбу ўжо каля дзесятка год. Слаўныя баявыя традыцыі барацьбы за вызваленьне Зах. Беларусі з-пад фашысцкай акупацыі Польшчы мае за сабой КСМ Зах. Беларусі. Ня было такіх выступленьняў працоўных супроць сацыяльнага і нацыянальнага прыгнечаньня, дзе-б ня прымаў актыўнага ўдзелу камсамол, які ва ўмовах самага жорсткага тэрору вёў і вядзе ўпартую барацьбу за масы працоўнай моладзі.

Зьезд адбываўся ў выключна адказнай абстаноўцы рэвалюцыйнага разьвіцьця, калі сударагі эканамічнага крызісу патрасаюць асновы капіталізму ў Польшчы, калі шпаркім тэмпам нарастаюць прадпасылкі рэвалюцыйнага крызісу. Цяжкасьць эканамічнага крызісу, які ўсё больш паглыбляецца, цяжкасьць ваеннага рэваншу польскага імпэрыялізму і абвостранага тэрору, што пераносьць на сваіх плячох працоўныя Польшчы, у Зах. Беларусі павялічваецца яшчэ калёніяльна - акупацыцкай палітыкай польскага фашызму.

Асабліва зьверска эксплёатуецца, эканамічна і палітычна прыгнятаецца працоўная моладзь Зах. Беларусі. Замірачэньне прамысловасьць выкідвае вялікія масы моладзі на вуліцу. У Беластоку, напрыклад, дзе раней працавала каля 400 чал. моладых тэкстыльшчыкаў, зараз яны ўсе беспрацоўныя. Дзяржаўныя прадпрыемствы, якія працуюць на ваенныя патрэбы, і чыгунка закрыты для яўрэйскай і беларускай моладзі. У Зах. Беларусі больш паловы рабочай моладзі—гэта беспрацоўныя. Тыя «шчасьлівцы» з моладзі, якія яшчэ сёньня маюць работу, вядуць поўгалоднае існаваньне. Іх заработак пры 10-14-гадзінным рабочым дні не перавышае 10 злотых (2 руб. 40 кап.) на тыдзень. Урады цхавы закон ставіць вучняў-падросткаў у становішча нявольнікаў свайго гаспадара, у якога яны працуюць.

Працуючы першы год дармова, другі — за 40 грошай (

Вытворчую практыку студэнтаў будаваць не „наогул“, А НА КАНКРЭТНЫХ АБ'ЕКТАХ

З-за галавацяпства чыноўнікаў з Белкаапсаюзу, дырэктароў Гомельскага лесаінстытуту і Мар'іна-Горскага тэхнікуму зрываецца практыка студэнтаў

Безадкладна ўпарадкаваць справу практыкі, павысіць адказнасьць органаў Нарасьветы, ведамственых устаноў і заводзкіх арганізацый за нападжваньне гэтай работы!

ЗА ДЗЕЙСНУЮ ВЫТВОРЧУЮ ПРАКТЫКУ

Цесная сувязь тэарытычнага навучаньня з практычнай работай на прадпрыемстве — у гэтым сутнасьць марксыцка - ленінскіх прынцыпаў навучаньня.

Падрыхтаваць патрэбных сацыялістычнаму будаўніцтву спэцыялістаў магчыма толькі пры ўмовах дабрай пастаноўкі вытворчай практыкі.

Падрыхтаваны ў чатырох сьценах навучальнай установы, набіты гопай, адарванай ад сацыялістычнага будаўніцтва тэорыяй, спэцыяліст не зможа задаволіць тых запатрабаваньняў, якія яму прад'яўляюцца задачамі рэканструкцыйнага перыяду. Такі спэцыяліст—гэта паперова таго, што нам патрэбна.

Відавочна, што ПРАКТЫКА студэнтаў нашых навучальных устаноў зьяўляецца НЕАДРЫЎНАЙ — АРГАНІЧНАЙ ЧАСТКАЙ УСЯГО НАВУЧАНЬНЯ. Гэта тым больш важна і неабходна ў нашых умовах, калі на Беларусі разгортваецца цэлы рад новых галін прамысловага будаўніцтва.

У партыйных пастановах, пастановах савецкіх устаноў на раз падкрэсьліваецца значэньне вытворчай практыкі і неабходнасьць яе карэннага паляпшэньня.

Аднак, на справе па сёньняшні дзень у галіне вытворчай практыкі ёсьць цэлы рад фактаў галавацяпства, моментаў абураючых безадказных адносін з боку адміністрацыі раду навучальных устаноў і нават кіруючых арганізацый.

ФАКТЫ ГОРКАЙ САПРАЎДНАСЬЦІ ПРЫМУШАЮЦЬ БІЦЬ ТРЫВОГУ.

Нельга цярпець такога становішча, калі ў важнейшай ва ўмовах Беларусі ВНУ—лесінстытуце значэньне правальваецца практыка. Дырэкцыя гэтага інстытуту яўна НЕДАЦЭНЬВАЕ значэньня вытворчай практыкі, ІГНАРУЕ ЯЕ. Кіраўніцтва партыйнай арганізацыі інстытуту патурае гэтым ганебным фактам.

Ня менш абураючымі зьяўляюцца факты, якія маюць месца ў арганізацыі практыкі студэнтаў каапэрацыйнага аддзяленьня наргасу БДУ. ЧЫНОЎНІКІ З БЕЛКААПСАЮЗУ, КАБ ПАЗБАВІЦЦА АД «НАДАЕДЛІВЫХ» СТУДЭНТАЎ, разьмеркавалі практыкантаў так, што шмат хто з іх атрымаў камандыроўку ў НЯІСНУЮЧЫЯ СПАЖЫВЕЦКІЯ ТАВАРЫСТВЫ.

РЭКОРД «лёгкадумных» адносін да практыкі, нечапавечых адносін да студэнтаў у даным выпадку НАЛЕЖЫЦЬ ДЫРЭКТАРУ МАР'ІНА - ГОРСКАГА садовагароднага тэхнікуму. Рошчаркам дырэктарскага пяра група студэнтаў пчалярнага аддзяленьня накіроўваецца ў саўгас, ДЗЕ НІКОЛІ НЯ БЫЛО НЯ ТОЛЬКІ ПАСЕКІ, АЛЕ НІВОДНАГА РАМАЧНАГА ВУЛЬЛЯ, ЦІ КАЛОДЫ.

МЫ ПРЫВОДЗІМ ГЭТЫЯ ФАКТЫ ДЛЯ ТАГО, КАБ ПАКАЗАЦЬ, ШТО Ў СПРАВЕ СТУДЭНЦКАЙ ПРАКТЫКІ СТАНОВІШЧА САПРАЎДЫ ПАГРАЖАЮЧАЕ.

Адна з асноўных бед, якая зьяўляецца ва многіх выпадках вытокам тай нерэзьбярыхі, што нагнядаецца ў галіне практыкі—месьціцца Ў БЕЗАЛАБЕРШЧЫНЕ, ЯКАЯ ІСНУЕ Ў СПРАВЕ СКЛАДАНЬНЯ ВЫТВОРЧЫХ ПРАГРАМ. Праграмы ў большасьці складаюцца насьпех, без патрэбнага ўліку вытворчых магчымасьцяй і асабліваесьцяй тэй ці іншай галіны прамысловасьці. У многіх выпадках становішча яшчэ горшае—праграм для вытворчай практыкі няма зусім.

Мы ў праве паставіць рубам пытаньне перад Наркамасьветы, Белкаапсаюзам і радам ведамственых устаноў: ДАКУЛЬ БУДУЦЬ ТВАРЫЦЦА ГЭТЫЯ БЯСЧЫНСТВЫ?

Ці не пара спыніць шматлікае бадзяньне студэнтаў і дарэмную трату дзяржаўных сродкаў на паездкі ў пошуках аб'ектаў практыкі.

Карэннае паляпшэньне вытворчай практыкі павінна ісьці па лініі ўпарадкаваньня справы з аб'ектамі і месцам практыкі. У прыватнасьці, неабходна дабіцца таго, каб студэнты, якія ня могуць праходзіць практыкі ў Беларусі з прычыны адсутнасьці патрэбных аб'ектаў—мелі магчымасьць выехаць за межы БССР на адпаведныя прадпрыемствы.

Трэба дабіцца, каб праграмы практыкі складаліся перад пачаткам навучальнага году і былі шырока абгавораны рабочымі на вытворчасьці і студэнцкімі масамі.

Разам з гэтым, неабходна ўзмацніць нагляд за прахаджэньнем практыкі студэнтамі з боку мясцовых партыйных арганізацый.

ТРЭБА ДАМАГЧЫСЯ ТАГО, КАБ ФАБРЫЧНА - ЗАВОДЗКІЯ АРГАНІЗАЦЫІ АДНОСІЛІСЯ ДА НАЛАДЖВАНЬНЯ ПРАКТЫКІ, ЯК ДА СПРАВЫ ВЯЛІКАЙ ПАЛІТЫЧНАЙ ВАЖНАСЬЦІ.

Дабіцца ДЗЕЙСНАЙ ВЫТВОРЧАЙ ПРАКТЫКІ магчыма толькі пры захаваньні ўсіх вышэйпаказаных умоў, толькі тады, калі будуць РАШУЧА ВЫЖЫТЫ наплываецькія, галавацяпскія адносіны да падрыхтоўкі кадраў.

Пра бяспрытульных пчаляроў і лёгкадумнага дырэктара

Сёлета ў Мар'іна-Горскім садова-гароднім тэхнікуме адкрылася пчалярнае аддзяленьне. Ва ўмовах Беларусі пчаляства адкрывае вялізарнае значэньне. Справа падрыхтоўкі пчаляроў — справа значэсная і адказная.

На жаль, знаходзяцца людзі, якія гэтую жывую справу прабуюць пахаваць зажыва, ня даўшы ёй ня тое, што расквітнець, але і хоць крыху выбіцца на паверхню.

Калі гаварыць у парадку суровай паступовасьці, выкладаючы факты, як яны ёсьць, дык 5 мая можна пічыць днём пачатку. 5 мая доўга будуць памятаць студэнты пчалярнага аддзяленьня Мар'іна-Горскага тэхнікуму!

У гэты дзень дырэктар Глушаноўскі выпраўў 24 особы з першага курсу на практыку ў саўгас Заціпша. Ня будзем закранаць прыгожасьцяй гэтага весьнавога дня. Лёгкадумны ветрык авяваў галаву шаноўнага дырэктара, з палёў выходзіў апошні сьнег, і моладзь марыла аб цікавай і карыснай рабоце ў саўгасе.

У Заціпшы практыкантаў-пчаляроў спаткала «маленькая» навіна, «выпадкова» ня ўлічаная адміністрацыяй тэхнікуму: малады саўгас пакуль што ня мае ніводнай калоды пчол!

І вось адэтакі баруць рытокі сумныя пандраваньні студэнтаў... З саўгасу Заціпша — у Менск, у сэктар кадраў Наркамзему; з Наркамзему — назад, у саўгас «да асобнага распараджэньня»; з саўгасу зноў у Менск, у Белкалгаспцэнтр, у Белсельтрэст, у райкалгасаюз.

Вінаватых у гэтай абураючай цягаціне і зьдзеках са студэнтаў пара пакаваць грамадзкасьці, паказаць іхны бядушна-чыноўніцкі твар і зрабіць адпаведныя вывады.

Разбураючы варожыя застаўкі, праз галовы бюракратаў і шкоднікаў, праз «лёгкадумства» дырэктарыі Глушаноўскіх, пчалярная гаспадарка Савецкай Беларусі павінна быць умацавана пралетарскімі кадрамі!

Юр. Лявонны.

Будучыя торфаспэцыялісты ў баку ад практыкі

Пры беларускім хэміка-тэхналёгічным інстытуце вось ужо два гады існуе аддзяленьне па хэмічнай апрацоўцы торфу. Па сваёй устаноўцы яно ня мае сабе падобных у мінулым, дый зараз ня мае, калі ня лічыць старанага ў пачатку бягучага навучальнага году хэмічнага аддзяленьня МТУ. Таму ад дырэкцыі інстытуту вымагаецца асаблівая ўвага і ініцыятыва ў арганізацыі і наложнай пастаноўцы работы гэтага аддзяленьня. На справе-ж атрымліваецца зусім адваротнае.

Іншыя аддзяленьні (шкляное, бразільнае), якія з посьпехам могуць выкарыстаць вопыт цэнтральных ВНУ, карыстаюцца куды больш значнай увагай з боку дырэкцыі, яны забясьпечаны высока-кваліфікаванымі спэцыялістамі і г. д. У той-жа час для выкладаньня і кіраўніцтва торфаддзяленьнем настойлівых запрашэньняў прафэсараў зусім не рабілася.

У выніку — у рабоце гэтага аддзяленьня шмат хібаў.

Вытворчае навучаньне студэнты 1-га і 2-га курсаў на працягу двух месяцаў адбывалі на мэталургічных заводах, а гэта ня мае ніякай сувязі з будучай спэцыяльнасьцю студэнтаў. Гэты факт трэба разглядаць проста, як парушэньне дырэктыў партыі ў падрыхтоўцы кадраў, бо, паводле гэтых дырэктыў, студэнты павінны праходзіць вытворчае навучаньне там, дзе яны будуць працаваць пасьля сканчэньня ВНУ. Практыка студэнтаў 2-га курсу павінна была пачацца з першых лічбаў мая, а праграмы дагэтуль не распрацаваны. Пытаньне аб арганізацыі вучэбна-практыкавальных лябараторый адкладзена на невядомы тэрмін.

Мэтадычны кіраўнік і загадчык спэцыялізацыі калуць:

«Новаторствовать мы не будем! В Москве таких лабораторий мы не видали».

Неабходнасьці іспаваньня лябараторый дырэкцыя, відаць, не разумее... Няма і патрэбнай тэхнічна-спэцыяльнай літаратуры.

Відавочна адно—далейшае разгортваньне навучальнай работы па гарадспэцыяльнасьці пры тым становішчы, якое ёсьць зараз, немагчыма.

СТУДЭНТ.

Як ВСНГБ выкарыстоўвае кваліфікаваныя кадры

Патрэба ў кваліфікаваных работніках прамысловасьці надавучай вострая. Асабліва адчуваецца яна ў ВСНГБ. Аднак адносіны да гэтай справы з боку ВСНГБ больш чым няўважлівыя.

На курсах электраманцёраў пры індустрыяльна- інструктарскім тэхнікуме ў Гомелі ВСНГБ закантрактаваў для трэ стаў Беларусі 70 чалавек. 6 мая, па сканчэньні курсаў, 19 чалавек прыбыла ў распараджэньне ВСНГБ. Замест хуткай расстаноўкі гэтых работнікаў па тых прадпрыемствах, дзе адчуваецца найбольшая патрэба, ВСНГБ па-бюракратычнаму адносіцца да гэтай работы, ня ўлічваючы сапраўдных патрэб тэй ці іншай галіны прамысловасьці. Так, у Барысаў Папертрэсту было паслана 5 чалавек. Але на другі дзень усе яны вярнуліся назад, бо Папертрэсту электраманцёры аказаліся непатрэбнымі. У Добруш было накіравана 6 чалавек, але і яны ўсе шэсьць вярнуліся, бо і там яны аказаліся непатрэбнымі. Затое ў Шклоў, куды трэба было паслаць 9 чалавек, ВСНГБ паслаў толькі 6. З рэшты курсантаў—частка накіравана па Менскіх прадпрыемствах, а 8 чалавек ня выкарыстоўваецца ні ка якой рабоце. Частка-ж гаварыцьмуть зусім адпушчаны да хаты, па прычыне таго, што патрэбы ў іх цёпыта няма.

ВСНГБ і трэсты ніякіх мер таксама ня прымаюць да забясьпачэньня жылой плошчай тых таварышоў, якія пакінуты на працы ў Менску.

Мы пытаемся ў ВСНГБ—чым вытлумачыць такія абураючыя адносіны да кадраў кваліфікаваных работнікаў, на падрыхтоўку якіх патрачана дзяржавай шмат грошай і патрэба ў якіх па радзе прадпрыемстваў, блазумоўна, вялікая.

Плян стандартызацыі-- плян тэхнічнага пераўзбраеньня

Да ўсебеларускай нарады па стандартызацыі

Трэці рашаючы год пяцігодкі павінен зьявіцца рашаючым і ў галіне стандартызацыі. XVI зьезд партыі ў сваіх пастановах даў у гэтым напрамку паўныя ўказаньні. «Плян работ стандартызацыі — плян першачарговых мерапрыемстваў нашага тэхнічнага пераўзбраеньня, барацьбы за якасьць прадукцыі і пытаньня капітальнага будаўніцтва», і далей —«павінны быць прыняты захады да пашырэньня тэхнічнай прапаганды, да ўцягненьня з дапамогай спэцыяльных грамадзкіх арганізацый шырокіх рабочых мас у справу ўкараненьня новай тэхнікі і выкарыстоўваньня творчай ініцыятывы мас з мэтай рэканструкцыі прамысловасьці». «Адначасова павінен быць шырока пастаўлен абмен вопытам рацыяналізатарскіх дасягненьняў. Для барацьбы з косным бюракратычным адносінамі да гэтай справы апарату і з сакрэтніцтвам павінны быць прыцягнуты шырокія рабочыя масы».

Сацыялістычная стандартызацыя набывае важнае значэньне і патрабуе непасрэднага і актыўнага ўдзелу мільёнаў рабочых. Рух за стандартызацыю атрымае выключнае разьвіцьцё, калі гэтыя мільёны ўдзельнікаў рабочых вытворчых працэсаў уключацца ў барацьбу за стандарт.

Непасрэдны ўдзел фабрык і заводаў — вось тая база, на якой можна рушыць наперад справу стандартызацыі. І ў сучасны момант найбольш складаным пытаньнем у галіне стандартызацыі, які тармозіць разьвіцьцё гэтай справы, зьяўляецца адсутнасьць арганізацыйнай сеткі па ведамствах і заводах.

Ня гледзячы на пастановы XVI-га партызезду аб усёй важнасьці праблемы стандартызацыі і пастанову ЦКК-НК РСІ ад 4-га верасьня 1930 г., дзе падкрэсьліваецца значэньне работ па стандартызацыі і рацыяналізацыі, СТАНОВІШЧА ОРГАНАЎ СТАНДАРТЫЗАЦЫІ АМАЛЬ ШТО ВА ЎСІХ ВЕДАМСТВАХ І АБ'ЯДНАНЬНЯХ ВЕЛЬМІ НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧАЕ. Да гэтага часу ўстановы і прадпрыемствы толькі «раскачваюцца». Работа па стандартызацыі ў ведамствах ідзе ў асноўным па лініі асобных выпадковых камісій, якія складаюцца з выпадковых асоб. Натуральна, гэтыя камісіі ня могуць адказваць ні за палітыку ў справе стандартызацыі, ні за практыку ў гэтай рабоце, Вырашэньне арганізацыйнага пытаньня ў справе стандартызацыі зьяўляецца асноўнай задачай дня — на гэты вучастак павінна быць накіравана ўся ўвага работнікаў па стандартызацыі.

Рабочая грамадзкасьць у БССР пачала большавіцкі паход за якасьнае пакаазаньніку, за масавы ўдзел у тэхнічнай рэканструкцыі народнай гаспадаркі. Трэба энэргічна, па-бальшавіцку фарсаваць разьвіцьцё стандартызацыі. З гэтай мэтай камітэт па стандартызацыі пры ЭКАНА БССР скліча 16-га мая ўсебеларускую нараду працаўніноў па стандартызацыі, у якой прымуць удзел працаўнікі ўсіх прамысловых аб'яднаньняў, буйнейшых заводаў, міжрайных аддзяленьняў беларускага камітэту стандартызацыі, інжынэрна-тэхнічных сіл. Вельмі пажаданы ўдзел рабкораў, прафсаюзнага і камсамольскага актыву і студэнцтва ВТНУ.

У парадку дня нарады наступныя пытаньні: праграмны даклад усесаюзнага на мітэту стандартызацыі, арганізацыйныя формы ведамственых і заводзкіх бюро стандартызацыі, аб кантролі над укараненьнем і захаваньнем стандарту і зваротнай мэтрарэформы, аб мэтадалёгі плянаваньня і ўліку.

Да нарады арганізуецца всытаўка друку, прысьвечаная пытаньням стандартызацыі.

Нарада павінна зьявіцца рашаючым момантам у справе стандартызацыі па БССР, вызначыць арганізацыйныя шляхі ў гэтай рабоце на заводах і ва ўстановах, даць плянавыя зданьні сацыялістычнай стандартызацыі беларускай гаспадаркі.

Вынікам нарады павінна быць шырокае прыцягненьне да актыўнага ўдзелу ў стандартызацыі рабочых-ударнікаў, прафсаюзаў, камсамолу і тэхнічнага пэрсаналу, каб жалезны пралетарскі закон якасьці і стандарту стаў штодзённым дзвізам у рабоце прадпрыемстваў.

Г-г.

Прывітаньне сакратара ЦК тав. Шаранговіча газэце „Чырвоная Зьмена“

Ад бальшавікоў Савецкай Беларусі баявое прывітаньне газэце Чырвонаштандартнага Камсамолу ў дзень яе дзесяцігадовага юбілею.

У бальшавіцкім календары дзесяць год—гэта вялізарнейшая колькасьць агністых дзён змаганьня за сацыялізм.

Старонкі нумароў газэты за мінуўшы дзесяць год — гэта сцэмантаваныя крывёю і волевай напружанасьцю старонкі славутай гісторыі Ленінскага Камуністычнага Саюзу Моладзі Беларусі.

Быць і надалей непахісным змагаром за генэральную лінію партыі, супроць выцікаў, малавераў і капітулянтаў, за разгорнутую пралетарскую самакрытыку, за далейшыя посьпехі сацыялістычнай індустрыі, за ліквідацыю кулацтва як класы на базе суцэльнай калектывізацыі, за пяцігоду за 4 гады—асноўная задача газэты.

«Чырвоная Зьмена» і надалей павінна а яшчэ большай настойлівасьцю і размахам, з яшчэ большым бальшавіцкім агнём мабілізоўваць мільённыя масы працоўнай моладзі Беларусі на барацьбу за аўладаньне вышынямі тэхнікі, рашаючага году, за няўхільнае і пасьлядоўнае ажыцьцяўленьне ленінскай нацыянальнай палітыкі і рашучую барацьбу з усялякімі не скажэньнямі, за «518» і «1040», за выкаланьне і перавыкананьне прамфінпляну, за сацыялістычную рэканструкцыю сельскай гаспадаркі і аўладаньне тэхнікай.

Няхай жыве «Чырвоная Зьмена»—баявая газэта другога бальшавіцкага пакаленьня!

Няхай жыве ўдарная брыгада будаўнікоў сацыялізму—Ленінскі Камсамол Беларусі і яго кіраўнік КП(б)Б!

Сакратар ЦК КП(б)Б ШАРАНГОВІЧ.

Агляд нізавога друку БССР--справа кожнага ваенкора БВА

Усім начпадывам і ваенкомам часьцей, разьмешчаных на тэрыторыі БССР

На 20-га чэрвеня назначан усебеларускі зьезд рабселькораў. 20-га мая па БССР будзе сьвяткавацца дзень пралетарскага друку, перапасены з 5-га мая. Зараз па БССР праходзіць масавы агляд-самаправерка становішча нізавога друку і рабселькораўскага руху. З 20-га мая абвяшчаецца ўсебеларускі месячнік пралетарскага друку. Усе гэтыя мерапрыемствы ЦК КП(б)Б накіраваны на яшчэ большае павышэньне ролі друку і рабселькораўскага руху ў сацыялістычным наступленьні, выкананьні лёзунгу «Кожны рабселькор—ударнік, кожны ўдарнік—рабселькор».

ЦК КП(б)Б яшчэ в пачатку красавіка ў сваёй пастанове абавязаў усе, у тым ліку і вайсковыя газэты БССР, зараз-жа разгарнуць шырокую сыстэматычную кампанію па падрыхтоўцы да Ўсебеларускага зьезду рабселькораў, але ніводная шматтыражка акругі не ўключылася яшчэ ў гэту палітычную кампанію.

Пуакр прапануе ўсім шматтыражным газэтам часьцей акругі неадкладна ўключыцца ў масавы агляд-самаправерку становішча нізавога грамадзянскага друку БССР і ў падрыхтоўку да ўсебеларускага зьезду рабселькораў.

Удзел ваенкораў у аглядзе павінен садзейнічаць:

1) паляпшэньню пастаноўкі ваеннай прапаганды ў грамадзянскім друку;
2) перадачы вопыту ваенкораў—на завод і вопыту рабкораў—у армію і 3) узмацненьню пралетарскага ўплыву на чырвоную казарму.

Фабрычна-заводзкі друк мае ўжо вялікі вопыт. Ён вынуў шмат новых форм работы. Агляд-самаправерка павінен паслужыць пачаткам сыстэматычнага абмену вопытам, наказам распаўсюджаньня новых форм, дапамагаючых узмацняць нашу балявую магутнасьць, узмацняць тэмпы і якасьць балявой падрыхтоўкі.

Норма прадстаўніцтва на ўсебеларускі зьезд дасылаецца падзвам.

Час. Вып. Пас. Начпузкра БВА
Т. КАРАБОЎ.

„СО“—неадрыўная частка АУЛАДАНЬНЯ ТЭХНІКАЙ

Лепшы вопыт удасканаленьня працэсаў вытворчасьці—на фабрыкі і заводы БССР

Лепшы вопыт прадпрыемстваў БССР—усім фабрыкам і заводам Савецкага Саюзу

Ударнікі, рацыяналізатары, вынаходцы, інжынэрна-тэхнічныя работнікі,—з дапамогай „СО“ арганізуйце штурм прарываў у выкананьні прамфінпляну

Плянавая сацыялістычная гаспадарка з поўнай выразнасьцю раскрывае перад усім сьветам свае перавагі перад капіталістычнай гаспадаркай і захаваныя ў ёй вялізарныя магчымасьці. На жаль, гэтыя магчымасьці і перавагі мы не заўсёды ўсьведамляем і скарыстоўваем. Фактычна толькі нядаўна мы падыйшлі да вырашэньня праблемы максымальнай мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў.

Траці год пяцігодкі павінен быць годам максымальнага разгортваньня ўсёй рацыяналізатарскай работы і АБМЕНУ ВЫТВОРЧЫМ ВОПЫТАМ, як аднаго з яе асноўных частак.

Сярод мэтадаў і шляхоў выкананьня дырэктыў партыі ад абмена вопытам гаварове месца належыць арганізаванай год назад КАРТАТЭЦЫ «СО» (сацыялістычны абмен вопытам). Задачай «СО» зьяўляецца сыстэматычная інфармацыя усіх прадпрыемстваў ад дасягненьняў на іншых аднародных прадпрыемствах у галіне рацыяналізацыі і вынаходзтва.

Кожная картачка «СО» пераносіць вопыт з аднаго прадпрыемства на другое і вядзе да максымальнага скарыстаньня ў маштабе СССР кожнай каштоўнай прапановы і кожнага вынаходзтва.

Злачынна дапускаць такое становішча, калі, напрыклад, дэлегацыя рабочых «Красного выборжца», прыехаўшы на Кальчугінскі завод для заключэньня дагавору аб сацспаборніцтве, выпадкова даведалася аб зьмене шамотных цаглін магнэзітам, што павялічвае колькасьць сплаву з 16 да 138 і скарачае рамонт у два разы.

На трох буйнейшых прадпрыемствах поўдню — Харкаўскім паравоза-будаўнічым, Луганскім паравоза-будаўнічым і Крамаўрыскім заводах — ужываліся тры розныя спосабы ліцьця і ніхто не клапеціўся аб тым, каб падзяліцца сваімі дасягненьнямі. Такіх фактаў можна прывесьці шмат.

Разгортваньне абмену вопытам праз картатэку «СО» павінна папажыць канец такім зусім недапушчальным фактам.

Плян рэдакцыі «СО» прадугледжвае выданьне ў 1931 г. 30 ТЫСЯЧ КАРТАК. Плян зусім рэальны пры ўмове прыцягненьня да выкананьня гэтай задачы рабочай грамадзкасьці і інжынэрна-тэхнічных сіл. Толькі пры іх актыўнай садзейнасьці гэта задача можа быць вырашана.

Трэба запомніць, што картатэка «СО» павышае тэхнічную граматнасьць рабочых, пашырае іх кругагляд і вызваляе масу вынаходцаў і рацыяналізатараў АД ВЫРАШЭНЬНЯ ЎЖО ВЫРАШАНЫХ ПЫТАНЬНЯЎ.

Зараз у БССР спэцыяльна створан пост рэдакцыі «СО», які павінен па-ўдарнаму разгарнуць работу. Партыйны і прафэсыянальны актыў, рацыяналізатары, вынаходцы, вытворчыя нарады і інжынэрна-тэхнічныя работнікі павінны дапамагчы ўсебеларускаму пасту «СО» ў выкананьні ўскладзенай на яго задачы. Трэба, з аднаго боку, перадаць для апублікаваньня ўжо ажыцьцёўленыя рацыяналізатарскія мерапрыемствы. З другога боку, — праверыць скарыстаньне картатэкі «СО» на даным прадпрыемстве.

Гутарка ідзе аб эканоміі ў маштабе СССР соцень мільёнаў рублёў. «СО» — адзін з найбольш верных мэтадаў мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў. Пастановы Сакратарыяту ЦК КП(б)Б, ЦСПСБ і БелМВІТ'у па гэтым пытаньні павінны быць неадкладна выкананы.

В. ПАЛЯКОЎ.

Недаацэнка „СО“ каштуе мільёны рублёў

МЕНСКІЯ ПРАДПРЫЕМСТВЫ АБМЯЖОЎВАЮЦЦА АБЯЦАНКАМІ

Аб разгортваньні сацыялістычнага абмену вытворчым вопытам ёсьць ужо рад аўтарытэтных дырэктыўных дакументаў. Апрача пастановы сакратарыяту ЦК КП(б)Б ад 2-га красавіка аб арганізацыі пасту «СО», адзначаную пастанову прыняў 1 сакратарыят ЦСПСВ. Цэнтральным праўленьням саюзу, гарадзкім і райпрафсаветам і фабзаўкомам прапанавана арганізаваць масавае абмеркаваньне пытаньня аб сацыялістычным абмене вытворчым вопытам, сталы кантроль над своячасовым ажыцьцяўленьнем усіх прапаноў, паводле картатэкі «СО», якія могуць быць ужыты на даным прадпрыемстве, прыцягнуць да гэтай работы спэцыялістаў, членаў інжынэрна-тэхнічных сэкцый і рабочых-вынаходцаў, склікаць шырокія нарады для прапрацоўкі пытаньня аб абмене вытворчым вопытам. Вытворчым нарадам, ІТО і ячэйкам вынаходніцтва прапанавана наладзіць сыстэматычны нагляд за своячасовай пасылкай у рэдакцыю «СО» прапаноў і вынаходніцтваў, якія былі ўжыты на даным прадпрыемстве і далі эканомію. Пралетсуд і ЦП саюзам даручана забясьпечыць масавы ўдзел студэнтаў, якія знаходзяцца на вытворчай практыцы, у справе арганізацыі «СО», дапамагаючы заводзкім арганізацыям правільна скарыстоўваць картатэкі і адсылаць праверваныя прапановы.

Культсэктару ЦСПСВ, усім прафарганізацыям, радыёцэнтру прапанавана разгарнуць масавую работу па клюбах, чырвоных куткох, арганізаваць кутні «СО», практыкаваць спэцыяльныя вечары, ставіць даклады аб «СО» на агульных заводзкіх, цэхавых, рабочых сходах, шырока скарыстаць друк для папулярызацыі «СО», рабочых вынаходніцтваў, прапаноў і г. д.

БелМВІТ прыняў пастанову і распрацаваў падрабязную інструкцыю для груп ІТР па садзейнасьці сацыялістычнаму абмену вытворчым вопытам. Праўда, інструкцыя, зацьверджаная прэзыдыумам БелМВІТ'у 5-га красавіка, толькі зараз рассылаецца. Інструкцыя прапануе ўсім бюро ІТО прадпрыемстваў і устаноў арганізаваць групы садзейнасьці «СО», праверыць скарыстаньне картатэкі «СО», выявіць каштоўныя прапановы, аформіць іх і паслаць у рэдакцыю «СО» для апублікаваньня, з 20-га мая пачаць рэгулярную работу па «СО», распрацаваўшы разам з аддзелам рацыяналізацыі плян гэтай работы і г. д.

З гаспадарчых аб'яднаньняў гэтымі днямі разаслалі дырэктыўныя ўказаньні сваім прадпрыемствам—неадкладна пераглядзець усе рабочыя прапановы і вынаходніцтвы за 1929-30 г., выявіць найбольш эфэктыўныя з іх і пераслаць беларускаму пасту «СО» пры ЦСПСВ для накіраваньня ў рэдакцыю «СО». У гэтых указаньнях ёсьць вельмі каштоўны пункт аб тым, што прапановы картатэкі «СО» павінны разглядацца як рабочыя прапановы і, у выпадку іх ухваленьня,—праводзіцца ў жыцьцё тым-жа парадкам.

Сэктар кадраў ВСНГБ прапанаваў мэханічнаму, хэміка-тэхналёгічнаму і будаўнічаму інстытутам абавязаць студэнтаў, якія накіроўваюцца на вытворчую практыку, за чаю практыкі зрабіць па некалькі чарцяжоў з тлумачэньнем, згодна рабочых і рацыяналізатарскіх прапаноў, і накіраваць іх для «СО».

Дырэктыў шмат. Аднак, арганізацыя «СО» да сёньняшняга дня амаль ня рухнула з месца. Цэнтральныя праўленьні саюзаў і фабзаўкомы не сьпяшаюцца з выкананьнем дырэктыў ЦСПСВ. Інжынэрна-тэхнічныя сэкцыі чакаюць гэтую самую падрабязную інструкцыю, якая ніяк не можа выйсьці з нетраў канцылярыі БелМВІТу. Вельмі нізкая кантрольная лічба збору рабочых прапаноў на красавік (56) ня выкананa. За красавік і да сёньняшняга дня беларускі пост «СО» не атрымаў ні адной рабочай прапановы, ні аднаго аформленага рацыяналізатарскага мерапрыемства. На май вызначана кантрольная лічба ў 150 прапаноў. Пры такіх тэмпах, зразумела, лічба гэтая ня будзе выкананa.

Менскія прадпрыемствы, якія падбольш цесна зьвязаны з беларускім пастом «СО», абмяжоўваюцца абяцанкамі. Арганізацыі швейнай фабрыкі «Кастрычнік» абяцалі да 15-га мая даць 10 прапаноў. Не далі яшчэ ні адной. Завод Імя Варашылава абяцаў гаўку-ж колькасьць прапаноў даць да 20-га мая. Вынікі тыя-ж. Завод «Бальшавік» абяцаў даць да 20-га мая 5 прапаноў. Пакуль ня даў ні адной. Завод «Ударнік» абяцаў да 15-га мая 4 прапановы—і гэтай нізначнай колькасьці ня даў. Завод «Камунар» да мая абяцаў 20 прапаноў—нічога яшчэ ня даў. А кіраўнікі менскай абутковай фабрыкі нават і абяцаць не хочуць, бачыце, няма тэхнічнага работніка для афармленьня пасобных прапаноў. Такі-ж малюнак і на іншых прадпрыемствах.

Дырэктыва ЦСПСВ аб арганізацыі рабочых сходаў, прысьвечаных «СО», ня выконваецца. Толькі на заводах Імя Варашылава і «Ударнік» адбыліся сходы тэхнічнага пэрсаналу (на «Ударніку» разам з прафактывам), якія выдумалі тройкі для афармленьня прапаноў і ўпаўнаважаных для укараненьня картатэкі «СО» і карэспандэнцкіх у рэдакцыю «СО».

Яшчэ горш стаіць справа з вынарыстаньнем картатэкі «СО». На заводзе Імя Варашылава за ўвесь час (калі году) скарысталі толькі дзьве прапановы, на заводзе «Бальшавік»—3 прапановы, на абутковай фабрыцы—ні адной. «Столкі-ж» на іншых прадпрыемствах.

Важнейшае мерапрыемства ў справе рацыяналізацыі на нашых фабрыках і заводах, мерапрыемства, якое павінна дапамагчы змагацца з прарывамі ў выкананьні прамфінпляну, не ажыцьцяўляецца. Двухдзённая праверка аўладаньня тэхнікай ня ўвазвецца з арганізацыяй сацыялістычнага абмену вытворчым вопытам, ня гледзячы на выразную пастанову аб гэтым сакратарыяту ЦСПСВ.

Значэньне пашырэньня абмену сацыялістычным вопытам вялізарнае. Картатэка «СО» ёсьць ужо каля 4 тысяч. З іх сотні могуць быць сёньня-ж ужыты на нашых прадпрыемствах. З другога боку на нашых прадпрыемствах ёсьць вельмі шмат новага і цікавага ў вытворчасьці, што трэба перадаць неадкладна іншым аднародным прадпрыемствам Савецкага Саюзу.

Недаацэнка значэньня «СО» каштуе Савецкаму Саюзу многа мільёнаў рублёў. Гаспадарчыя, партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі павінны неадкладна ўзяцца за больш актыўнае ажыцьцяўленьне шматлікіх дырэктыў аб арганізацыі «СО». Плян выпуску 30 тысяч картак «СО» у 1931 г. павінен быць выкананы. Ён будзе выкананы толькі пры дадаткова шырокай пралетарскай грамадзкасьці і актыўным удзеле інжынэрна-тэхнічных сіл.

П.

Лепшы вопыт-- на прадпрыемствы БССР

У парадку абмену вопытам арганізацыі «СО» і мабілізацыі грамадзкай думкі вакол гэтага пытаньня мэтагодна будзе коратка расказаць аб тым, што робіцца ў гэтым напрамку па ленінградзкім заводзе «Красный путиловец».

Яшчэ ў канцы студзеня г.г. на заводзе адбылася нарада, прысьвечаная «СО». Спынімся на найбольш цікавых прапановах гэтай нарады.

Калектыву ЛКСМ даручана абавязаць сваіх членаў ІТР рэгулярна прапрацоўваць для картатэкі «СО» ня менш 2-х прапаноў у месяц і гэту работу лічыць, як важнейшую грамадзка-палітычную нагрузку.

Беспартыйны актыў ІТР вырашана скарыстаць у парадку прафдысцыпліны на гэтай рабоце, абавязаўшы тэхнічны пэрсанал цэхаў распрацаваць па аднэй прапанове з ліку ажыцьцёўленых у даным цэху. Тэхнічны пэрсанал аддзелаў і кантор павінен распрацаваць па 2 прапановы ў месяц.

Калектыву камсамолу і бюро ІТС даручана ў парадку грамадзкай нагрузкі вылучыць таварышоў, адказных за выкананьне работы па абмене вопытам. Вырашана скарыстаць, на падставе дырэктыў ЦК УсеКП(б), усіх студэнтаў-практыкантаў, прыцягнуць да распрацоўкі рацыяналізатарскіх прапаноў студэнтаў ВТНУ. Аддзелу кадраў прапанавана (на падставе распараджэньня дырэктара заводу) не даваць студэнтам заліку па вытворчай практыцы да пачаў давадкі ВРЫЗ'у аб распрацоўцы ня менш 2-х прапаноў.

Рэдкалегіі шматтыражкі даручана шырока асьвятліць значэньне і ход абмену вытворчым вопытам. У прыватнасьці апублікаваць сьпісы таварышоў, якія спрыяюць абмену вопытам, а таксама сьпісы асоб, якія тармозяць гэту работу.

На гэтай-жа нарадзе вырашана пачрыхтаваць агульна-заводзкі конкурс на лепшы цэх, аддзел і кантору. І тых, і іх, хто дасьць найбольшую колькасьць распрацаваных прапаноў, выдаць адпаведную прэмію.

Зусім правільна нарада адзначыла, што гэтыя мерапрыемствы, ажыцьцяўленыя бюро рацыяналізацыі і ВРЫЗ'ам разам з грамадзкімі арганізацыямі і органамі друку пры актыўным удзеле маньні інжынэрна-тэхнічных работнікаў, павінны ў бліжэйшы-ж час зрабіць рашучы пералом у справе распрацоўкі рабочых прапаноў і узмацніць абмен вытворчым вопытам паміж заводамі Савецкага Саюзу і «Красным путиловцем».

Фабрыкі і заводы БССР, распрацоўваючы пляны разгортваньня «СО», павінны гэты вопыт «Красного путиловца» поўнасьцю прыстасаваць у сябе.

Абмен лепшым вопытам работы перадавых прадпрыемстваў Савецкага Саюзу ва

УШЧЫЛЬНЕНЬНЕ ТЭРМІНАУ СЯЎБЫ

ВЫРАШАЕ ПОСЬПЕХ БАЛЬШАВІЦКАЙ ВЯСНЫ

Койданаўскі, Полацкі і Аршанскі раёны ўключыліся ў конкурс на перавыкананьне пляну веснавой сяўбы

НІ АДНАГО РАЁНУ, КАЛГАСУ, САЎГАСУ, НІ АДНЭЙ МТС ПА-ЗА КОНКУРСАМ

Самая бязьлітасная барацьба са спробамі падмяніць зьдзельшчыну падпраўленай зьдзельшчынай

Полацак спаборнічае з Вулай

У КАЛГАСЫ І С.-С. ДАСЛАНЫ ЎМОВЫ КОНКУРСУ

ПОЛАЦАК. (Па тэлеграфу). Полацкі раён уключыўся ў сацыялістычнае спаборніцтва на лепшае і хутчэйшае правядзеньне сяўбы. Створан раённы штаб па правядзеньні конкурсу, вылучаны ўпаўнаважаныя па сельсаветах.

Брыгада самакатчыкаў даставіла ва ўсе калгасы і сельсаветы ўмовы конкурсу.

40 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак раёну аб'яднаны ў калгасах. Ворыва ў калгасах ужо канчаецца. Зараз у раёне разгарнулася масавая сяўба.

Полацкі раён выклікаў на сацыялістычнае спаборніцтва Вульскі раён.

Штаб па правядзеньні агляду ТАМАШУК.

У мінімальныя тэрміны

САЎГАС „НОВАСЁЛКІ" ВЫКЛІКАЎ НА СПАБОРНІЦТВА САЎГАС „ШЫКАТОВІЧЫ"

Агульны сход рабочых саўгасу **«НОВАСЁЛКІ»** вітае пастанову ЦК КП(б)Б аб правядзеньні агляду і аб разгортваньні сацыялістычнага спаборніцтва паміж саўгасамі, калгасамі і МТС у другую бальшавіцкую вясну.

Сход пастанаўляе ўключыцца ў абвешчаны конкурс на лепшае і хутчэйшае правядзеньне сяўбы і выклікае на сацыялістычнае спаборніцтва саўгас **«ШЫКАТОВІЧЫ»**.

Сход даручае ячэйцы КП(б)Б, адміністрацыі і рабочкому разгарнуць сацыялістычнае спаборніцтва ўнутры саўгасу «Новасёлкі», стварыць прэміяльны фонд для прэміяваньня лепшых ударнікаў і ударных брыгад. Іншаўдарнікаў і прагульшчыкаў заносіць на чорную дошку.

Каб скончыць сяўбу і мінімальныя тэрміны, сход пастанавіў мабілізаваць усе ўнутраныя сродкі. Ахапіць усіх рабочых культурна-масавай работай, для чаго скарыстаць настаўніцтва і аграмэдпэрсанал.

Рэдкалегіі насьценгазэты даручана правесьці адпаведную работу сярод рабкораў і ўдарнікаў з тым, каб кожны рабкор быў ударнікам і кожны ўдарнік—рабкорам.

На працягу пасеўнай кампаніі выпускаць кожную пяціднёўку насьценную газэту, у якой асьвятляць ход сяўбы і выкананьне ўмоў конкурсу.

Прэзыдыум сходу.

Зьдзельшчына на паперы

Складаныя машыны не скарыстоўваюцца

ВУЛА. (Наш кар.). Перавод на зьдзельшчыну калгасаў у раёне праходзіць вельмі марудна. Дагэтуль па Вульшчыне па зьдзельшчыну пераведзена 37 калгасаў з 88, што складае 42 проц.

У раёне наглядаецца пэўная недаацэнка палітычнай важнасьці гэтага мерапрыемства. Трэба адзначыць, што з ліку 37 калгасаў, якія пераведзены на зьдзельшчыну, ёсьць такія, якія толькі фармальна, на паперы пераведзены.

У калгасе імя Будзённага праўленьне разважае так: «Зьдзельшчына — рэч добрая. Мы яе прынялі, але ўвесьці яе можам, бо палі ня вымераныя. Дайце нам... каморніка, тады ўвядзем».

У некаторых калгасах проста заяўляюць: «Будзем працаваць ударна з раніцы да вечара, а зьдзельшчыны мы не разумеем, бо старыя людзі». Такі вынік кулацкай агітацыі, імкненьняў клясавага ворага сарваць зьдзельшчыну.

Усё гэта паказвае, што шырокай растлумачальнай работы па ўкараненьні зьдзельшчыны ніхто не праводзіў.

Ёсьць выпадкі няправільнага правядзеньня зьдзельшчыны, устанаўленьня зьніжаных норм. Так, у калгасах Вусацкага сельсавету ўстаноўлена норма — ачысьціць мох з 15 фруктовых дрэваў і а гэта вызначаецца адзін працадзень. Можна-ж зусім лёгка ачысьціць 30 дрэваў. У той-жа час вызначана перапавялічаная норма па пабелцы дрэваў — 80 яблынь, а на самой справе трэба было ўстанавіць ня больш, чым 40.

Толькі 80 калгасаў маюць рахункаводаў. Рэшта калгасаў не забясьпечана рахунковымі работнікамі. Справы заблытаны. Зьдзельшчына вымагае выразнага ўліку і без рахунковых работнікаў ня можа быць праведзена. Падрыхтоўка кадраў на раёне амаль саромна. Курсы праведзены толькі на 50 проц.

***

Папярэднія вынікі сяўбы ў Вульскім раёне паказалі, што калгасы ня ўмеюць карыстацца складанымі машынамі. Сяўба амаль ва ўсіх калгасах ідзе ўручную, у той час, як сявяркі стаяць і чакаюць пакуль да іх дакранецца вопытная рука. Калгас «Камунар», Гарбаціцкага сельсавету, атрымаў сявярку і ніяк ня можа яе скласьці, бо перадок ад другой машыны. Зімою былі такія выпадкі, калі калгасы зварочвалі складаныя машыны, спасылаючыся на тое, што яны ня пойдуць на цьвёрдай глебе (сашніковыя сявяркі).

Аграномы раёну справай аўладаньня тэхнікай ня кіруюць. Неабходна тэрмінова навучыць калгасьніка карыстацца складанай машынай, забясьпечыўшы сяўбу сявяркай. Пасьля сканчэньня сяўбы трэба арганізаваць куставыя кароткатэрміновыя практычныя заняткі па вывучэньні складаных машын: касілак, жнівярак і інш. Трэба навучыць калгасьніка ня толькі карыстацца гэтымі машынамі, але і рабіць дробны рамонт.

А. МІКУЦКІ.

Зноў „палачкі"

ВОРША. Аршанскі райкалгассаюз ня ведае, што робіцца ў калгасах, якія знаходзяцца на адлегласьці 3-5 клм. ад райцэнтру. У калгасе «Чырвоная горка» плян веснавой сяўбы складзен бюракратычна. Калі, што і як трэба рабіць—аб гэтым плян нічога не гаворыць. Дырэктыва аб пераходзе на зьдзельшчыну засталася на паперы. Замест вучоту якасьці працы працягваюць ставіць палачкі. Нормы зьдзельшчыны не распрацаваны. За вучот працы няма адказнай асобы. Трэба прымусіць райкалгассаюз зацікавіцца, што робіцца ў бліжэйшых калгасах.

Я. Б.

Няма вытворчага пляну

НЕ ХАПАЕ ЦЯГАВАЙ СІЛЫ

МСЬЦІСЛАЎЛЬ. (Наш кар.). У Мсьціслаўскім раёне «Сьвінаводтрэст» арганізоўвае саўгас на плошчы каля 1.500 гэкт. Замест таго, каб скончыць арганізацыю саўгасу ў зімовы час, трэст аформіў саўгас, як гаспадарчую адзінку толькі ў першых лічбах красавіка. Саўгас пакінуты бяз сродкаў, без кіраўніцтва і бяз усякай дапамогі.

Да апошняга часу саўгас ня мае вытворчага пляну. Трэст Сьвінавод нават не паклапаціўся прыслаць аграпома, каб дапамагчы скласьці вытворчы плян.

Саўгасу патрэбна цягавая сіла, а сродкаў для набыцьця яе няма. Намесьнік дырэктара саўгасу тав. Райчанка купляе коняй на павер. Без капейкі грошай куплена 10 коняй, 10 цэнтн. кармоў і г. д.

У сакавіку саўгасу патрэбны былі сані для перавозкі інвэнтару і насеньня. У трэст быў пасланы рад тэлеграм з просьбай выслаць сані. Толькі нядаўна трэст раскачаўся і ў маі саўгас, атрымаў сані. Тое-ж самае было-б напэўна і з калёсамі, калі-б кіраўнікі саўгасу не зьвярнуліся ў адпаведныя органы і ня прымусілі-б трэст паклапаціцца аб своячасовай дасылцы калёс.

Насеньне ў саўгас яшчэ не дастаўлена, угнаеньне яшчэ знаходзіцца на чыгуначнай станцыі. Цягавай сілы ня хопіць нават для апрацоўкі паловы яравога кліну.

Машына-трактарная станцыя адмаўляецца дапамагчы саўгасу, спасылаючыся на тое, што яна павінна ў першую чаргу дапамагаць калгасам. Ёсьць пагроза, што значная частка зямлі саўгасу застанецца незасеянай.

Кіраўніцтва саўгасам з боку трэсту Сьвінавод выявілася ў тым, што адзін інструктар мэтэорам пранёсься па саўгасе, зьеў яешню і зьнік.

Трэст Сьвінавод павінен быць прыцягнут да адказнасьці за такое «кіраўніцтва» саўгасам. Як цэнтральныя, так і раённыя арганізацыі павінны ўсімі мерамі дапамагчы саўгасу ва што-б там ні стала засеяць яравы кліп.

М.

Трактары без прычапных прылад

ЛЮБАНЬ. Добрая падрыхтоўка раду калгасаў да веснавой сяўбы, арганізаваны выхад у поле і пераход на зьдзельшчыну — выклікалі новую хвалю калгаснага прыпіву.

У калгас «Асьвета» за апошнюю дэкаду ўступіла 107 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, у калгас «Іскра» 81 гаспадарак, у калгас «Зьвязда» — 23 гаспадаркі і г. д.

Калгас «Асьвета» заключыў сацыялістычны дагавор на лепшае правядзеньне сяўбы з камунай імя ВВА. На калгасных палёх працуе 10 трактараў саўгасу імя 10-годзьдзя БССР.

Першыя дні сяўбы выявілі і рад недахопаў. Так, трактары часта псуюцца, не хапае плугоў для трактараў. Вельсельснабам дасланы сявяркі бяз частак. Часткі, дасланыя да сявярак, якія былі атрыманы ў мінулым годзе, няпрыгодны і калгасам прыходзіцца засяваць уручную.

Кавапенка.

Зьдзельшчына ўзмацніла прыліў у калгасы

РАГАЧОЎ. Пасеўная кампанія ў самым разгары. На 10 мая па 10 сельсаветах засеяна калгасамі 562 гэкт. бульбы і інш. яравых культур. Падрыхтаваны для сяўбы. 1.200 гэкт. Аднаасобным сэктарам засеяна 321 гэкт. Нормы выпрацоўкі ў радзе калгасаў брыгадамі перавыконваюцца.

Пераход калгасаў на зьдзельшчыну і ударныя тэмпы работ пры сяўбе выклікалі новы прыліў у калгасы. За 6 дзён веснавой сяўбы ў раёне арганізавана два новых калгасы. У існуючых калгасы ўступіла 119 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

Вялікім тормазам у разгортваньні сяўбы зьяўляецца недахват цягавай сілы і насеньня, асабліва ў новаарганізаваных калгасах.

МТС, райкалгассаюз і калгасаюз павінны прыняць тэрміновыя меры для забесьпячэньня гэтых калгасаў патрэбным насеньнем і цягавай сілай.

Прыбыўшыя ў саўгасы 6 трактараў дасланы без прычапнога інвэнтару.

САЛАДУХІН.

Недахоп аграномаў і каморнікаў

затрымлівае выхад у поле новых калгасаў

ЛЯДЫ. (Па тэлеграфу). Арганізаваны выхад калгасаў у поле выклікаў новую хвалю калгаснага прыпіву. За 18 дзён мая арганізавана 12 новых калгасаў. Раён калектывізаваны на 43,1 проц. Зараз праводзіцца абагульнальнае жывёлы, інвэнтару і насеньня ў новых калгасах.

У раёне адчуваецца востры недахват аграномаў і каморнікаў, што затрымлівае складаньне вытворчых пляноў і перавод на зьдзельшчыну новых калгасаў.

Ворша ўключылася ў конкурс

ВОРША. (Па тэлеграфу). Аршанскі РК КП(б)Б разам з рэдакцыяй «Ленінскі прызыў» уключыліся ў конкурс на лепшае правядзеньне сяўбы, шляхам сацыялістычнага спаборніцтва. Створан раённы штаб. Для дапамогі калгасам у пераходзе на зьдзельшчыну і арганізацыі ўліку работы, у сельсаветы выяжджаюць 30 работнікаў раённага актыву.

РК КП(б)Б вызначыў чырвоны сьцяг і 500 руб. прэміі калгасам і саўгасам, якія лепш і хутчэй правядуць сяўбу.

У першай калёне бальшавіцкай сяўбы

У калгасе «Орка», Шклоўскага раёну, зьдзельшчына была часткова ўведзена яшчэ ў 1930 годзе на работах па апрацоўцы ільну, абмалоце збожжавых культур і г. д.

Зьдзельшчына плюс ударніцтва даюць вышэйшыя вынікі. Гэта дазваляе работа ўдарнай брыгады калгасьнікаў «Орка», якая апрацоўвала лён. Гэта брыгада, каб паскорыць адчуў ільну даржаве прадавала ночу, выконваючы ўдзень іншыя работы. У мінулым годзе расцэнка работы ў калгасе была ў грошах. За пасадку адной капы ў сушні і абіўку ільну калгас устанавіў расцэнку ў 50 кап.

Група з 3-х калгасьнікаў ночу за 4 гадзіны работы апрацоўвала 6 кон ільну (1 гадзіна ішла на пасадку і 3 гадзіны на абіўку).

У суседнім калгасе «Чырвоны Кастрычнік», дзе існавала зьдзельшчына, група калгасьнікаў з 5 чал. на працягу 6-гадзіннай дзённай працы абівала толькі 5 кон.

Такім чынам калгасьнікі «Орки» пры больш цяжкіх умовах начной работы, працавалі ў тры разы прадукцыйней, чым калгасьнікі «Чырвонага Кастрычніка».

У гэтым годзе калгас «Орка» ўсе работы перавёў на зьдзельшчыну. Нормы выпрацоўкі, прынятыя калгасам, па радзе работ перавышаюць прыкладныя нормы. Зьніжэньняў норм — зусім няма. Усе калгасьнікі працуюць добра, перавыконваючы свае зьдзяньні.

Калгас «Орка» выклікаў на сацспаборніцтва калгас «Чырвоны Кастрычнік». Заключаны дагавор на правядзеньне пасеўкампаніі ў найкарацейшы тэрмін, на поўнае выкананьне агрэгамінімуму і пашырэньне пасеўплошчы. Пасеўная плошча ў калгасе «Орка» параўнальна з мінулым годам павялічана на 10 проц.

Калгас ня толькі спраўляецца ўласнымі сіламі з усёй работай, але навет дапамагае адстаючым калгасам. У мінулым годзе «Орка» дапамагала камуне «Мілерава» рабочай цягавай сілай, а таксама калгасу імя Карла Маркса.

У калгасе на 273 гэкт. пахалі ёсьць 66 працаздольных жанчын і мужчын.

Значныя посьпехі калгасу «Орка» тлумачацца правільнай арганізацыяй зьдзельшчыны, выразнай расстаноўкай сіл калгасьнікаў і сацыялістычнымі мэтадамі ў штодзённай рабоце калгасьнікаў.

К—аў.

ЗМАГАЦЦА НЯ ТОЛЬКІ ЗА КОЛЬКАСЬЦЬ, АЛЕ І ЗА ЯКАСЬЦЬ ПАСЕВАЎ ІЛЬНУ І КАНАПЕЛЬ

Пастанова калегіі НКЗ БССР

Зацьверджана СНК БССР 14 мая 1931 г.

У мэтах павялічэньня прадукцыі ільнаканапляводзтва шляхам павышэньня ўраджайнасьці, калегія Народнага Камісарыяту Зямляробства БССР пастанаўляе:

1. Правесьці наступныя агратэхнічныя мерапрыемствы:

Па ільне:

а) Пры выбары месца для пасеву ільну скарыстаць у першую чаргу кашэшчыну і новыя распашкі, у другую чаргу — плошчы з-пад іншых бабовых расьлін і з-пад асьмяных і ў трэцюю чаргу — з-пад збожжавых;

б) вызначаныя пад лён плошчы павінны быць узараны пад зяблева;

в) веснавое баранаваньне праводзіць як мага раней;

г) калі плошча пад лён ня была ўзарана з восені, рабіць раней веснавое ворыва, як толькі глеба ня будзе мазацца;

д) перад пасевам ільну добра выбаранаваць глебу, каб на не паверхні не заставалася буйных кавалкаў;

е) угнаеньні, якія атрымліваюцца гаспадаркамі для ўнясеньня пад лён, уносіць пад гэту культуру, а не пад іншыя;

ж) увесь попел, які ёсьць, скарыстаць пад лён;

з) сеяць добра ачышчаным ільнанасеньнем;

і) пасеўнае ільнанасеньне павінна быць праверана на ўсходжасьць;

к) норму высеву ільну на 1 гэктар устанавіць 1—1,2 цнт. замест устаноўленай нормы ў 1 цнт.;

л) пры налушчасьці ў гаспадарцы насеньня розных гатункаў сеяць іх у пасобку, ня зьмешваючы;

м) у бягучую пасеўкампанію сеяць лён у наступныя тэрміны:

да 20 мая павінна быць пасеяна 30 проц. усяго засеву ільну, да 1 чэрвеня — 20 проц., да 10 чэрвеня — 30 проц.,

н) калі да зьяўленьня ўсходаў ільну на паверхні стварылася корка ад дажджу, рабіць баранаваньне лёгкай баранай;

о) правесьці поліва ільну ў 2—3-тыднёвым узросьце пры вышыні сьцяблоў ў 10—15 сант.;

п) у выпадку зьяўленьня шкоднікаў паведаміць аб гэтым мясцовых агрономаў і весьці барацьбу са шкоднікамі па ўказаньнях агрономаў;

р) уборку ільну праводзіць, як правіла, у часе жоўтай сьпеласьці, не дапускаючы да поўнай ўсходжасьці насеньня. У выпадку недахвату рабочай сілы для ўборкі ільну, пачынаць уборку яшчэ раней — у проталень;

с) ачосваньне ільняных галовак, або абмалот рабіць, як мага раней, і не пазьней 10 верасьня, каб вымачыць, або выслаць лён пры цёплым надвор'і;

т) у мэтах роўнамернай вылежкі ільну і павышэньня яго якасьці зрабіць пераварочваньне трасты на сьцеліўчы;

у) пры мочцы ільну ў мачылах не дапускаць завальваньня яго дзярнінай.

Па канопліях:

а) абавязкова скарыстаць пад канопі ўсе старыя канапляньнікі;

б) сеяць канопі ня толькі на прысядзібных гародных землях, але і вносіць абавязкова іх пасевы ў поле;

в) павялічыць пасеў плошчы пад канопі на асушаных гарфяньніках;

г) пры палявой культуры канапель сеяць апошнія пасьля канюшыны і іншых бабовых, а таксама пасьля кораньклубнеплодаў;

д) ворыва глебы пад канопі і ўнясеньне гною правесьці з восені;

е) веснавое баранаваньне рабіць, як мага раней;

ж) калі плошча пад канопі ня была ўзарана з восені і ня быў унесен гной, зрабіць гэта рыньвай вясною, як толькі магчыма будзе выехаць у поле;

з) уносіць пад канопі камбінаванае ўгнаеньне (гной і штучныя ўгнаеньні);

і) сеяць добра ачышчаным насеньнем;

к) пасеўнае насеньне павінна быць праверана на ўсходжасьць;

л) нормы высеву канапель на 1 гэктар устанавіць 1,2 цнт. замест устаноўленай нормы ў 1 цнт.;

м) сеяць канопі радковай сявяркай;

н) праводзіць на пасевах канапель боразны для скарыстаньня іх пры ўборцы плосканьня;

о) у выпадку зьяўленьня шкоднікаў паведаміць аб гэтым мясцовых агрономаў і весьці барацьбу са шкоднікамі паводле ўказаньняў агрономаў;

п) абмалаціць канопі як мага раней і не пазьней 15 верасьня, каб магчыма было вымачыць іх пры цёплым надвор'і;

р) нагрузку канапель пры мочцы зрабіць каменьнямі, не дапускаючы завальваньня іх дзярнінай;

с) пасьля ўборкі канапель сьцягнуць бараной усю сувалаку і спаліць яе.

2. У саўгасах ільнаканапляводтрэсту, а таксама ў калгасах ільнаканапляводчых раёнаў павінны быць узяты ўсе пералічаныя ў п. 1 мерапрыемствы.

3. У калгасах ільнаводчых раёнаў і ў аднаасобных гаспадарках усіх раёнаў павінна быць ужыта ня менш 10 мерапрыемстваў па ільне і ня менш 10—па канопліях.

4. Абавязаць райза, райкалгассаюзы і райкаапсаюзы правесьці шырокую растлумачальную работу на ўдзельцы мерапрыемстваў па павышэньні ўраджайнасьці ільну і канапель. Аграмінімум павінен быць абмяркован, на агульных сходах рабочых саўгасаў, калгасьнікаў і бядняцка-серадняцкага сялянства. Гэту работу скончыць да 20 мая.

5. Прапанаваць райвыканкомам арганізаваць улік ужываньня аграмінімуму.

6. За невыкананьне гэтай пастановы дырэктары саўгасаў прыцягваюцца да крымінальнай адказнасьці, калгасы падлягаюць штрафу да 100 рублёў і аднаасобнікі — да 50 рублёў.

НКЗ БССР — РАЧЫЦКІ.

Ніводнаго калгасу па-за спаборніцтвам

УСІМ СТАРШЫНЯМ РАЙКАЛГАССАЮЗАЎ І КАЛГАСАЎ

ДАРАГІЯ ТАВАРЫШЫ!

Пастаўленыя партыяй і ўрадам задачы ў галіне сацыялістычнага развіцьця жывёлагадоўлі патрабуюць ад нас напружаных бальшавіцкіх тэмпаў работы, якія могуць быць забясьпечаны толькі на аснове сацыялістычнага спаборніцтва і творчага энтузіязму шырокіх калгасных мас.

На жаль, прыходзіцца канстатаваць, што сацыялістычныя метады працы на падставе сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва ў нашых калгасах ужываюцца вельмі павольна і туга.

У гэтым вінаваты ў першую чаргу мы, — работнікі калгасных сыстэмы, якія да гэтага часу не прынялі выстарчальных мер па шырокім разгортваньні сацыялістычных форм працы ў шырокіх масах калгасьнікаў.

Мы просім вас тэрміново абгаварыць у сябе гэтае пытаньне і правесьці шырокую кампанію па разгортваньні сацспаборніцтва і ўдарніцтва ў калгасах, фермах, а таксама паміж РКС, забясьпечыўшы ўдзел у прапарцыі дагавораў шырокіх калгасных мас, паставіўшы перад сабой задачу — ніводнага калгасу, ніводнай калгаснай фермы і брыгады без дагавору на сацспаборніцтва. Сацспаборніцтва і ўдарніцтва павінна разгортвацца вакол наступных асноўных пытаньняў:

1. Найлепшае правядзеньне веснавой і асенняй пасеўных кампаній. Сустрэчныя планы па засеве, своячасовасьць пасеваў.

2. Хутчэйшае выкананьне плянаў па развіцьці сацыялістычнай жывёлагадоўлі, асабліва ў калгасных таварных фермах.

3. Якаснае паляпшэньне жывёлы, усямернае павышэньне яе таварнасьці.

4. Поўнае і своячасовае выкананьне плянавых заданьняў і абавязацельстваў па здачы таварнай прадукцыі фермамі. Паляпшэньне якасьці прадукцыі.

5. Стварэньне моцнай кармавой базы, неабходнай для развіцьця жывёлагадоўлі, з разьліку поўнага забясьпячэньня жывёлагадоўлі ўласнымі кармамі.

Асаблівую ўвагу зьвярнуць разгортваньню сідасаваньня і ўжываньню гальлёвага корму, агратэхнічных мерапрыемстваў на паляпшэньні лугоў і пашы.

6. Поўнае выкананьне будаўнічых плянаў у калгасах і ў першую чаргу ў таварных фермах з найлепшай якасьцю будаўніцтва ў тэрміны, а таксама максымальная замена дэфіцытных будаўнічых матэрыялаў мясцовымі.

7. Найлепшае, своячасовае правядзеньне ўборачных кампаній.

8. Хутчэйшы і поўны перавод працы на зьдзельшчыну, ліквідацыя абязьлічкі, добрыя адносіны да жывога і мёртвага інвэнтару, аўладаньне тэхнічнымі ведамі ва ўсіх галінах калгаснай будоўлі.

Кожны прадаўнік РКС, кожны загадчык фермы, кожны калгасьнік і калгасьніца ў сваёй штодзённай працы павінны дабіцца такога становішча, «каб праца ператварылася з ганьбнага і цяжкага ярма, якой яна вічылася раней, у справу гонару, справу славы і гэройства» (Сталін).

Пры заключэньні дагавораў трэба не абмяжоўвацца агульнымі пунктамі, а канкрэтна вызначыць пазязьлікі па кожным мерапрыемстве і тэрміны іх выкананьня.

Побач з гэтым, трэба арганізаваць рэгулярную праверку вынікаў сацспаборніцтва спэцыяльнымі брыгадамі, а таксама практыкаваць прэміяваньне лепшых ударнікаў.

Дагаворамі па сацспаборніцтве і ўдарніцтве ахапіць усе сьвінагадоўчыя і малочныя фермы і вылучыць брыгады па праверцы гэтых дагавораў.

Аб прынятых мерах і дасягнутых выніках просім вас інфармаваць разам з апэрацыйна-вытворчай работай.

Нам. старшыні БКЦ —СТРЭЛЕ.
Нам. загадчыка Бел. Аддзел. Сьвінаводкалгасцэнтру — ПАЛЕСКІ.
Нам. заг. Бел. Аддзелен. Малкалгасцэнтру, — АЎЧЫНЬНІКАЎ.

Зьдзельшчына рашае

Вёска **ЖЫТАНЕЖЫ** шырока расхінулася абапал 20-цімётровай, тонкай, як струна, пяскаватай вуліцы, якая цягнецца на гару.

Жытанежы хутка мяняе свой твар, ператвараючыся з дробна-ўласьніцкай, старой—у новую вёску—калгас «Трактарыст». Са 120 двароў — 70 у калгасе. Амаль 60 проц. Лічба прыкладная для многіх вёсак Беларусі.

Калгасьнікі з Жытанеж, даючы назву свайму калгасу, выбралі «Трактарыст». Трактарыст гэта той, хто, трымаючы ў моцных руках руль перадавой сельскагаспадарчай тэхнікі, заклікан гістэрыяй руйнаваць заросшыя тоўстай мурожынай межы, якія вякамі трымалі сялянства ў цемры і галечы.

Калгас «Трактарыст» апраўдвае сваю назву, стараннa будуючы сваю новую калектыўную гаспадарку.

***

Пасьля доўгай зімы, раптоўна наступіла вясна і не абы-якая, а другая бальшавіцкая. Раптоўнасьцю «Трактарыста» не спалохаеш, бо ён гатовы сустрэць вясну ўдарнай штурмавой работай на полі. Ужо пяты дзень, як выйшлі брыгады на сяўбу і вядуць спаборніцтва на лепшае і хутчэйшае выкананьне свайго брыгаднага заданьня.

Асноўных брыгад, якія перайшлі на зьдзельны мэтад работы, у «Трактарысьце» шэсьць. З увагнаньнем зьдзельшчыны ў калгасе пачалася новая паласа жыцьця. «Хто больш працуе, той больш атрымлівае» — гэта правіла добра ведаюць калгасьнікі з «Трактарыста» і стараюцца рабіць і зарабіць.

Брыгады: аратых, баронавалокаў, сеяроў, будаўнікоў, гародная і па догляду жывёлы, гэта асобныя цэхі калгасу.

Кожная брыгада ў пачатку палявой работы атрымала парад-заданьне на поўную колькасьць працы, ацэненая ў працадзён. Брыгады, абмеркаваўшы парад на сваіх сходах, выйшлі ў поле ў поўным разуменьні пастаўленых перад імі задач.

***

Брыгада баронавалокаў баранує зяблівае ворыва пасьля зімы. Коні запражаны па двое ў новенькія афарбаваныя ў зялёны колер, жалезныя бораны «Зіг-саг». Вострае зуб'е «Зіг-заг» скубе зьлежалую глебу. Успушчаная зямля, зараз-жа прасушваецца і робіцца шэрай. На першы погляд здаецца, што гэта прабаранаваная зямля ня ўсім перасохла і ня дасьць вільгаці насеннаму зерню.

Але гэта на першы погляд толькі. Глебныя сокі ідуць з глыбіні наверх, як газа ў лямпе на кноце, і калі яна зьверху ня сустракае пласта глебы—выпарваецца ў паветра. Роля пасьлязімовага баранаваньня і зводзіцца да таго, каб затрымаць вільгаць, якая накапілася ў глебе пасьля раставаньня сьнегу і веснавых дажджоў.

Гэту нямудрую тэорыю ведаюць вунь тыя маладыя баранавалокі, што старанна падганяюць змораных коняй.

— Ну, Сьцяпан, заварочвай жвавей, а то засьнеш відаць скора, — падганяе брыгадзір - камсамолец Мікола Сьцяпана, які замарудзіў на павароце і тым самым затрымаў едучых ззаду другіх баронавалок.

— Закурыце, хлопцы, а то ўжо замарыліся і коні запацелі, нехай адпачнуць.

— Рана. Вось заедзем у канец загону, тады якраз трэба будзе адпачыць, — вытлумачыў хлопец у камсамольскім гарнітуры—камсамолец.

Завярнуўшы ніпчэ раз брыгада пад'ехала да дарогі, стала на пяціхвілінны адпачынак, неабходны для перадышкі коняй. Коні пасталі як прыкутыя да зямлі, не жадаючы зварухнуцца—замарыліся.

Баронавалокі селі на мурожыны кружком, і смачна ўплітаючы махорачны дым, расказвалі пра сваю працу.

— Мы (брыгада баронавалокаў) маем заданьне,—расказваў брыгадзір, — гэты кавалак у 28 гэктараў забаранаваць у два сьляды. Уся гэта работа ацэньваецца ў 14 працадзён. У брыгадзе 7 чалавек, гэту працу мы павінны зрабіць за два дні.

— Скончым раней, — падхопліваюць другія,—мы ўжо ня першы дзень працуем і ведаем, што гэта мы скончым заўтра гадзіны на 3-4 раней.

Самаўпэўненасьць брыгады не пакідае месца для сумненьня. У сандагаворы брыгады далі абяцаньне павысіць нормы выпрацоўкі і павышаюць.

***

Гоняй за двое ад баронавалокаў працавала брыгада плугароў. Блізкая адлегласьць давала магчымасьць брыгадам наглядаць адна за адной, як хто стараецца, у сваю чаргу стараючыся не адставаць, а пераганяць.

У плугароў большасьць людзей дарослых, у іх лепшыя, дужэйшыя коні. Ворыва — больш цяжкая і адказная праца. Кожная прапушчаная лапіна поля—агрэх адбіваецца на якасьці выпрацоўкі, зьніжаючы ўраджайнасьць.

У плугароў кругавая парука за якасьць, усе глядзяць адзін за адным, каб ня было агрэхаў і другіх непарадкасьцяй пры ворыве. Плуг павінен быць добра адрэгуляваным, на поўную глыбіню і шырыню ўспашкі, коні таксама запрагаюцца роўна, бо няўмелая запражка ня дасьць добрай работы і добрым плугам.

Сёньня плугары ўруць бульбяніча пад засеў ячменю.

Вельмі прыгожа глядзець, калі адзін за адным ідуць 10 плугоў, адварочваючы за адзін раз 2,5-3,0 метра мяккай глебы, прыкладваючы гэту шырокую стужку да ўжо ўзаранага палетку.

Старая агранамія кажа, што і 1 параконны плуг павінен за 10-гадзінны дзень узарань 0,50 гэкт. Гэта старое. Новае-ж паказвае «Трактарыст», тут у сярэднім узораюць ад 0,65 да 0,75 гэктара.

Плугар за сваю працу зарабляе 1,25 працадзён, праца лічыцца цяжкой.

Брыгада плугароў, як і ўсе іншыя па такой-жа форме атрымала такі парад-заданьне:

НАРАД № 1

па брыгадзе плугароў калгасу „Трактарыст"

Прозьвішчы працуючых у брыгадзе	Колькасьць цягавай сілы.	Месца працы.	Тэрмін выкананьня.	Колькасьць работы.	Адзінка ў працадзёнах.	Адзнака аб працы кожнага рабочага			
						3	4	5	6 і г. д.
Запісана 10 чалавек, якія знаходзяцца ў брыгадзе плугароў.	20 коняй.	Урочышча «Круглая Галіна»	З 3-У па 7-У (4 дні).	30 гэкт. пад ячмень.	46 пр. дзён.				

Заданьне даў старшыня праўленьня

Прыняў брыгадзір

Нарад канкрэтна дае заданьні і добра ставіць улік работы, спрыяе далейшаму ўзьдыму працоўнага энтузіязму калгасьнікаў.

— Мой плуг надта добра аро, проста сам ідзе, толькі пасьпявай з ім хадзіць, —хваліцца Лявон, — коні налажыліся хадзіць і на паваротах самі ведаюць куды ісьці, за лейцы нават брацца ня трэба.

— Затое мой нешта скача, трэба будзе заўтра раніцою завесьці да каваля, ды наладзіць, — адазваўся Лявонаў сусед па баразьне.

Пагутарыўшы і пакурыўшы, плугары паехалі далей стругаць новыя чорныя 3-гэктравыя істужкі зямлі, коні пасьля невялікага перапынку з новай сілай прыняліся напіраць на хамуты дужымі плячыма.

***

Сейбіты дзелящца на 2 часткі. Адна частка брыгады працуе з машынамі — 10-радковымі сявяркамі. Радковых сявярак 2 і працуе на кожнай па 3 чалавекі і 3 кані, а ўсяго 6 і 6. Другая частка брыгады — сейбіты рукамі, 4 чалавекі. Машынная брыгада сее пераважна больш капітоўныя культуры, больш паважаючыя сявярку, гэта: пшаніца, ячмень, гатункоўны авёс. Заданьне (норма) на 2 сявяркі 6 гэктараў у дзень.

Ручным спосабам сеяцца кармавы авёс, лён, гарох, а таксама штучнае ўгнаеньне, бо сявяркі для штучных угнаеньняў у «Трактарысьце» няма, што значна зьніжае прадукцыйнасьць працы сейбітаў. Кожны сейбіт уручную засявае ў дзень 2,5 гэкт., а ўсе 4 чалавекі — 10 гэктараў. Уся брыгада сейбітаў за дзень засявае 16 гэктараў. На гэту плошчу патрэбна вялікая колькасьць насеньня, а таму да брыгады сейбітаў прымацаваны спэцыяльны падвозчык насеньня.

Сейбіты заключаюць работу на полі. Ад работы сейбітаў, асабліва працуючых на сявярцы, залежыць вельмі многае. Уважлівасьць і акуратнасьць — першае правіла для сейбітаў. Сашнікі і шасцёрці ў сявярцы часта засьмечваюцца і несвячасовае зьніжэньне гэтай засьмечанасьці прыводзіць да таго, што на полі, калі ўзойдуць пасевы, выяўляюцца незасеяныя лапіны. Гэтыя чыстыя лапіны найгоршыя, ганебная пляма на якасьці працы сейбітаў.

— Гэй, Алесь, глядзі вунь, ужо начапляліся на сашнікі, ачышчай хутчэй.

Алесь падлётак, ён бегае ззаду за сявярнікам і спэцыяльным секачом на канцы доўгай палкі разразае сьмяцьцё, якое набіраецца на сашнікі, што перашкаджае зерню нармальна класьціся ў канаўкі, зробленыя дыскамі сявяркі.

***

Брыгада па гародах і доглядае за тэхнічнымі і кармавымі культурамі, а таксама па пасадцы бульбы, складаецца з жанчын. Гэта камбінаваная брыгада кідаецца ў тое месца, дзе ёсьць тэрміновая работа.

Жаночая брыгада садзіць раньнюю гародніну — цыбулю. Уся брыгада разьбіта на партыі, кожная партыя робіць адну работу, першая партыя сядзіць і цярэбіць цыбулю, падрыхтоўвае яе да пасадкі, другая падносіць. Трэцяя садзіць і чацьвёртая палівае пасаджанае.

Гледзячы здалёк здаецца, што на гародзе непарадак, мітусьня. Але падыходзіць бліжэй кідаецца ў вочы якраз адваротнае, кожны член брыгады заняты поўнай справай.

— Як цёткі працуеце?

— Ды як-жа? Садзім вось цыбулю, ды скора і гуркі будзем, гароду ў нас шмат —15 гэктараў, — ахвотна расказвае пажылая цётка.

— Нам усяго 6 гэктараў патрэбна, а 9 мы для гораду сеем, — далае дзяўчына са значком «КІМ» на сукенцы.

Маткі спакойна працуюць на полі, у гародзе, хляве. Іх дзеці будуць падгэўшы і дагледжаны ў калгасных ясьлях.

Зімою большасьць жанчын сядзела па хатах — сусьлілі кудзелю, а цяпер з надыходам вясны ўсім знайшлася праца, хоць адбеўляй. Дома засталіся старыя да малыя. Усе працаздольныя на полі, змагаюцца за планы другой бальшавіцкай.

*

Закон аб сельгаспадатку—у масы

Падрыхтоўку да ўліку аб'ектаў абкладаньня—

на рэйкі ўдарніцтва і сацспаборніцтва СЕЛЬСАВЕТАЎ і ФІНОРГАНАЎ

Папулярызацыя новага закону аб сельска-гаспадарчым падатку выклікае масавы прыліў у калгасы і выкананьне кантрактацыйных дагавароў

Сельгаспадатак заўсёды зьяўляўся адным з магутных сродкаў ажыцьцяўленьня палітыкі партыі на вёсцы. Роля сельгаспадатку ў гэтым годзе яшчэ больш павялічваецца. Новы закон аб с.-г. падатку дапамагае замацаваньню посьпехаў калгаснага будаўніцтва, далейшаму разгортваньню калгаснага руху, росту прадукцыйнасьці сельскай гаспадаркі.

Задачам посьпяховага правядзеньня сельгаспадатку павінен быць адданы максымум увагі.

У бліжэйшыя дні па большасьці раёнаў пачынаецца ўлік аб'ектаў абкладаньня. Гэту работу трэба ўвязаць з шырокай агітацыяй за скарыстаньне ільгот па сельгаспадатку, на справе паказаўшы перавагу калгасаў у параўнаньні з аднаасобнымі гаспадаркамі.

Папулярызацыя закону праведзена нездавальняюча

Весткі з месц паказваюць, што да апошняга часу растлумачэньне новага закону праведзена нездавальняюча. Раённыя арганізацыі ў радзе месц, недаацэньваючы палітычна-гаспадарчага значэньня сельгаспадатку, не аддаюць патрэбнай увагі яго папулярызацыі. Стара-Дарожскі райфінаддзел, напрыклад, паведамляе, што агіткампанія праходзіць вельмі павольна. З ліку 19 удзельнікаў куставой нарады па сельгаспадатку, праведзенай у Віцебску, толькі 7 прадстаўнікоў раёнаў сёе-тое ведалі ад тым, як ідзе кампанія папулярызацыі, астатнія не маглі паведаміць, як стаіць у раёне гэта справа. Такі-ж малюнак выявіўся на куставой нарадзе Аршаншчыны.

Не гаворачы ўжо аб калгасьніках і працоўным сялянстве, нават работнікі сельсаветаў ня ведаюць разьмераў і парадку прадастаўленьня ільгот па сельгаспадатку.

Навярстаць упушчанае

Перад сельсаветамі, усімі вясковымі арганізацыямі, у часе выданьня новага закону аб сельгаспадатку, была пастаўлена задача шырока папулярызаваць новы закон, каб кожны калгасьнік, кожны бадняк і серадняк-аднаасобнік да выхаду ў поле ведалі аб ільготах па сельгаспадатку. І таму, у некаторых мясцовасьцях лічаць, што агітработа па сельгаспадатку скончылася з пачаткам сяўбы, што калі папулярызацыя не праведзена, дык ужо поўна навярстаць упушчанае. З гэтакімі шкоднымі поглядамі трэба рашуча змагацца. Неабходна дабіцца, каб у часе ўліку аб'ектаў с.-г. падатку растлумачэньне ільгот ня толькі ня спынялася, але яшчэ больш узмацнілася.

Поўнасьцю ўлічыць аб'екты

Ад поўнага ўліку аб'ектаў абкладаньня залежыць разьмер шчыльнай сумы падатку і правільнае разьмеркаваньне яго на сацыяльна-эканамічных групах вёскі. Між тым, дагэтуль па БССР недаўлічаны тысячы гэктараў зямлі і мільёны рублёў неазямляробчых прыбыткаў. Задача выяўленьня ўтоеных аб'ектаў павінна быць у цэнтры ўвагі ўсяго вясковага апарату. Значна дапамогуць у гэтай справе матар'ялы, атрыманыя пры зямляўпарадкаваньні калгасаў, калі на радзе вёсак выяўлена ўтойваньне 50 і больш процантаў зямлі. Гэтыя матар'ялы трэба сыстэматызаваць і паслаць сельсаветам. Трэба сваячасова скарыстаць весткі розных устаноў і арганізацый аб неазямляробчых заробках. РВК і сельсаветы павінны дабіцца поўнага выяўленьня заробку на сходах, ні ў якім разе не абмяжоўваючыся частковымі выбаркамі.

Закон дае сельсаветам права накладаць штрафы на ўтойшчыкаў аб'ектаў абкладаньня. Сельсаветы павінны скарыстаць гэта права, праводзячы выразны клясавы падыход. Сельсаветы павінны рашуча адмовіцца ад леташняй практыкі фармальных адносін да штрафаваньня, калі пастановы аб штрафах не рэалізаваліся месяцамі.

Падрыхтаваць работнікаў па ўліку

Закон усклада большую частку работы па сельгаспадатку на сельскія падатковыя камісіі. Тэхнічная складанасьць уліку і нявопытнасьць многіх работнікаў сельсаветаў патрабуюць узмоцненага нагляду і інструктаваньня з боку райвыканкомаў шляхам прымаваньня да сельсаветаў спэцыяльных упаўнаважаных. РВК павінны сачыць, каб сельскія падатковыя камісіі працавалі калегіяльна, каб іх работа не падмянялася дзейнасьцю старшыні і сакратара сельсавету. Упаўнаважаныя РВК у мінулыя гады працавалі толькі на паперы, былі дрэнна падрыхтаваны і часта, замест практычнай дапамогі сельсаветам, толькі блыталі іх работу. Трэба дабіцца, каб упаўнаважаныя былі добра праінструктаваны і прымалі непасрэдны ўдзел ва ўліку аб'ектаў сельгаспадатку на тых сельсаветах, да якіх яны прымаваны.

Максымум увагі—індывідуальнаму абкладаньню

Асаблівай увагі ўсіх арганізацый патрабуе справа індывідуальнага абкладаньня кулацкіх гаспадарак. Пры правядзеньні гэтага мерапрыемства ў 1930-31 годзе мелі месца буйныя недахопы: недавыяўленьне кулакоў і іх прыбыткаў, патураньне кулацкім гаспадаркам і, побач з гэтым, «лявацкія» загібы ў адносінах да серадняка. Зусім недапушчальнай зьяўляецца леташняя практыка, калі аж да самай восені ў некаторых раёнах зусім «не знайшлі» кулакоў. Толькі пасьля таго, як быў прыняты рад рашучых мер, вылавіліся дзесяткі кулацкіх гаспадарак. Пухавіцкія раённыя арганізацыі на працягу некалькіх год не заўважылі 14 былых абшарнікаў, якія мелі аднакі кулацкіх гаспадарак.

Леташнія памылкі сёлета не павінны паўтарацца. Трэба мабілізаваць максымум сіл на поўнае выяўленьне і індывідуальнае абкладаньне ўсіх кулацкіх гаспадарак. Адначасова трэба рашуча караць за папыраньне індывідуальнага абкладаньня на серадняцкія гаспадаркі. Раённыя партыйныя арганізацыі і райвыканкомы павінны катэгарычна патрабаваць ад кіраўных арганізацый, каб кожная гаспадарка, прызначаная да індывідуальнага абкладаньня, абавязкова абгаварвалася на сходах груп бедноты і калгаснікаў.

Ільготы па с.-г. падатку павінны быць скарыстаны

Ня прыходзіцца растлумачваць вялізарнага палітычнага і гаспадарчага значэньня ільгот па сельгаспадатку, сумы, на якія зьмяншаецца падатак, у сувязі з гэтымі ільготамі, з ліпкам акупаюцца выгадамі ад папыраньня пасеўнай плошчы, уздыму гаварнасьці сельскай гаспадаркі як у калгасах, так і ў працоўных аднаасобных гаспадарак. Практыка мінулага году паказала, што многія райвыканкомы і сельсаветы фармальна-бюракратычна аднесьліся да дачы ільгот. Ня ўсе калгасы і аднаасобныя працоўныя гаспадаркі атрымалі прадугледжаныя законам ільготы. Раённыя ўстановы і арганізацыі павінны памятаць, што своячасовая і поўная дача ільгот зьяўляецца важнейшым палітычна-гаспадарчым мерапрыемствам, якому трэба аддаць максымум увагі.

Абкладаньне кан'юнктурных даходаў—новая складаная справа

Закон прадугледжвае абкладаньне ў серадняцкіх аднаасобных гаспадарках даходаў ад продажу прадуктаў сельскае гаспадаркі па павышаных цэнах. Не абкладаюцца прыбыткі ад продажу толькі тых прадуктаў, па якіх гаспадарка выканала плянавыя заданьні па загатоўках і кантрактацыйных дагаварах. Таксама не абкладаюцца даходы ад продажу па павышаных цэнах тых прадуктаў, па якіх гаспадарка ня мела цьвёрдага заданьня, кантрактацыйнага дагавору, самаабвясьцельства, пры ўмове, што гэта гаспадарка прадала дзяржаўным ці каапэрацыйным арганізацыям ня менш 75 проц. усіх праданых гаспадаркай прадуктаў па асобных відах іх.

Гэта мерапрыемства, бязумоўна, будзе спрыяць выкананьню плянавых загатоўчых заданьняў і кантрактацыйных дагавароў.

Абкладаньне кан'юнктурных даходаў ад продажу прадуктаў с.-г. зьяўляецца новай і досыць складанай справай. Таму РВК і сельсаветы павінны з усёй уважлівасьцю адносіцца да складаньня сьпісаў гаспадарак, якія маюць гэтыя прыбыткі, таксама да вызначэньня разьмеру даходу. У мэтах папярэджаньня перагібаў у данай справе прадугледжана абавязковае абгаварваньне сьпісаў гэтых гаспадарак і іх даходаў на сходах калгаснікаў, беднякоў і актывістаў сераднякоў. Зразумела, гэта ні ў якім разе ня зьнімае адказнасьці з сельсаветаў за вынікі абкладаньня кан'юнктурных даходаў.

Насустрач бядняцкім гаспадаркам

Палітыка партыі і ўраду ў адносінах беднякоў-аднаасобнікаў застаецца нязьменнай. Некалектывізаваная беднота будзе сёлета поўнасьцю і часткова вызвалена ад падатку, пры чым пры вызваленьні беднаты будзе ўжывацца індывідуальны падыход да кожнае гаспадаркі з тым, каб унікнуць леташніх памылак, калі ў беднякі залічаліся плацежаздольныя гаспадаркі. Абавязкова вызваляюцца паасобныя гаспадаркі тых членаў калгасаў, якія якія летась, да ўступленьня ў калгас, былі ўключаны ў сьпісы вызваленай ад падатку бедноты.

Работа па складаньні сьпісаў беднаты павінна насіць масавы характар, праводзіцца пры дапамозе груп і сходаў беднаты.

Трэба з усёй рашучасьцю папярэдзіць раёны ад вызначэньня кантрольных лічбаў беднаты, якая вызваляецца ад падатку, бо гэта абавязкова даводзіць да перагібаў, вызваленьня часткі плацежаздольных гаспадарак, недастатковага ахопу беднаты.

Кампанія сельгаспадатку можа быць пасьпяхова праведзена толькі пры шырокім разгортваньні ўдарніцтва і сацспаборніцтва паміж сельсаветамі і фінансавымі органамі.

Посьпех кампаніі залежыць ад таго, наколькі партыйныя арганізацыі здолеюць уцягнуць масы калгасьнікаў, батрацтва і беднаты ў дапамогу правядзеньню сельгаспадатку.

М. Т.

Плян кантрактацыі перавыкананы

У выніку папулярызацыі закону аб с.-г. падатку

АЗАРЫЧЫ. (Наш кар.). Марцінаўскі сельсавет, Азарыцкага раёну выканаў плян кантрактацыі пасеваў на 125 проц. як па аграмаджаным, так і па аднаасобным сэктары. Посьпех кантрактацыі выклікан шырокай растлумачальнай работай, праведзенай вакол закону аб с.-г. падатку.

Абгаварэньне закону выклікала прыліў у калгасы

ДРЫБІН. (Па тэлеграфу). Канферэнцыя калгаснікаў, беднякоў і сераднякоў — аднаасобнікаў Кляцкавіцкага сельсавету, Дрыбінскага раёну, абгаварыла новы закон аб сельгаспадатку. Канферэнцыя цалкам ухваліла новы закон, накіраваны на ўзмацненьне сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. У выніку абгаварэньня закону за адну дэкаду ўліліся ў калгасы 42 гаспадаркі.

***

ГРЭСК. (Наш кар.). Беднякі і сераднякі вёскі Гацукі, Грэскага раёну, абгаварылі новы закон аб сельгаспадатку. На сходах беднякоў і сераднякоў прынятыя пастановы, у якіх удзельнікі сходаў горача вітаюць новы закон—магутную зброю калектывізацыі сельскай гаспадаркі. Абгаварэньне новага закону выклікала масавы прыліў у калгасы. На адным са сходаў арганізаваны новы калгас «Бальшавік».

Транспартная зводка

АБЯЗЬЛІЧКА ЯШЧЭ ЖЫВЕ

ЗА ПАРУШЭНЬНЕ СПАРАНАЙ ПРЫЦЯГВАЦЬ ДА АДКАЗНАСЬЦІ, ЯК ЗА СУПРАЦІЎЛЕНЬНЕ АЗДАРАЎЛЕНЬНЮ ПАРАВОЗНАЙ ГАСПАДАРКІ

Камісія выкананьня пры СНК БССР

аб парушэньнях спаранай

За супраціўленьне пераходу на спараную зьнімаецца з працы нач. дэпо Жлобін т. Сарокін

Камісія выкананьня пры СНК БССР заслухала даклады прадстаўнікоў дырэкцыі МБД чыгункі і Гомельскага эксплёатацыйнага раёну пра выкананьне дырэктыў партыі і ўраду аб пераходзе на спараную язду.

Камісія ў сваёй пастанове канстатавала, што гэтыя дырэктывы поўнасьцю не ажыцьцяўлены. У Гомельскім эксплёатацыйным раёне зрыў спаранай па таварных паравозах даходзіць да 15 проц., у ЖЛОБІНСКІМ—да 76 проц., па таварных паравозах, а па пасажырскіх і манэўравых паравозах яшчэ існуе абязьлічка. Зрыў спаранай ёсьць таксама ў АРШАНСКІМ і ВІЦЕБСКІМ раёнах МБД.

Камісія выкананьня адзначыла супраціўленьне пераходу на спараную язду з боку начальніка дэпо ст. Жлобін тав. САРОКІНА, а таксама скрытае супраціўленьне ў дэпо ВІЦЕБСК.

Прапанавана упаўнаважанаму НКШЗносін пры СНК БССР, дырэкцыі МБД і Заходняй чыгунцы забясьпечыць поўны і неадкладны пераход на спараную, зараз-жа ліквідаваўшы наяўныя прарывы. Начальнікам ГОМЕЛЬСКАГА, ЖЛОБІНСКАГА, АРШАНСКАГА і ВІЦЕБСКАГА раёнаў прапанавана ў 5-дзённы тэрмін правесьці прымацаваньне брыгад да ўсіх пасажырскіх, таварных і манэўравых паравозаў. Намесьніку упаўнаважанага НКШЗносін пры СНК БССР прапанавана на працягу дэкады ўзмацніць спэцыялістамі кіраўніцтва дэпо ЖЛОБІН, АСІПАВІЧЫ, МАГІЛЕЎ і службы цягі ВІЦЕБСКАГА вузла.

Камісія выкананьня абавязала кіраўніцтва Заходняй чыгункі неадкладна зьняць з працы начальніка дэпо ЖЛОБІН тав. САРОКІНА за супраціўленьне ажыцьцяўленьню дырэктыў партыі і ўраду аб пераходзе на спараную.

Адначасова камісія выкананьня адзначыла, што існуючая сыстэма вучоту апалу, пры якой вынікі ядомы толькі праз 2-3 месяцы, ня выклікае зацікаўленасьці ў эканоміі апалу з боку паравозных брыгад і паставіла пытаньне перад камісіяй выкананьня пры СНК СССР і НКШЗносін СССР аб зьмене сыстэмы вучоту, перадаўшы веданьне вучотам у эксплёатацыйныя раёны і дырэкцыям чыгунак.

Камісія выкананьня пастанавіла давесьці да ведама НКШЗносін СССР аб тым, што, ня гледзячы на двухразовае паведамленьне дырэкцыям Заходніх чыгунак, на якой ёсьць найбольшыя прарывы ў пераходзе на спараную, ня прыслала свайго прадстаўніка ў камісію выкананьня пры СНК БССР, а даручыла зрабіць справаздачу па Заходняй чыгунцы Гомельскаму эксплёатацыйнаму раёну.

Вінаватых у зрыве спаранай --да адказнасьці

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). У красавіку па клм., а машыніст Лебедзеў, які ехаў на адным паравозе, за 180 гадзін зрабіў 2.453 клм.

Гомельскім вузлом былі абураючыя факты парушэньня спаранай. Так, машыніст Жыткоўскі, на працягу гэтага месяца езьдзіў на пяці паравозах, машыніст Замчынскі—на чатырох, Фурса—на пяці, Хомач—на чатырох і г. д. Толькі на грох паравозах з усяго ліку пасажырскіх цягнікоў ехалі сталыя прымаваныя брыгады. Яшчэ горш становішча з таварнымі паравозамі. Кожны машыніст у сярэднім езьдзіў на чатырох паравозах. Такое становішча адбілася на выкананьні вымяральнікаў. Машыніст Жыткоўскі, які езьдзіў на пяці паравозах, за 186 гадзін зрабіў 2.345 клм., у той час, калі машыніст Чапкоўскі, які езьдзіў на адным паравозе, за 179 гадзін зрабіў 4.259 клм. Такое-ж становішча і на таварных цягніках. Машыніст Андрэйчук, які езьдзіў на чатырох паравозах, за 192 гадзіны зрабіў 1.832

Гэтыя лічбы ярка паказваюць перавагу спаранай язды. Адна, кіраўнікі Гомельскага вузла, яшчэ недаацэньваюць гэтага, парушаючы зусім ясныя дырэктывы партыі і ўраду па гэтым пытаньні. Бінаватыя ў зрыве спаранай павінны быць сурова пакараны.

Б.

5 зрываў за 5 дзён

МАГІЛЕЎ. (Наш кар.). Па віне адміністрацыі дэпо МАГІЛЕЎ зрывы спаранай язды ня зьмыты. Так, за першую пяцідзёўку мая было 5 выпадкаў зрыву спаранай. Зрывы тлумачаць нераспарадчасьцю адміністрацыі, безадказнымі адносінамі да выкананьня дырэктыў аб ліквідацыі абязьлічкі, неналаджанасьцю выклікаў і інш.

ЧЭНЛА.

Чыгуначныя непаладкі

§ Біпетнае аддзяпеньне Гомельскага саюзтрансу пераведзена ў надзвычай дрэннае памяшканьне, дзе наведвальнікам нават няма дзе стаіць у чарзе і, чэньне. Такое становішча асабліва нецярпіма зараз, калі палянпэньню абслугоўваньня пасажыраў падаецца вялікае значэньне.

К. З.

Павышэньнем адказнасьці за паравоз дабіліся відавочных посьпехаў

ПОЛАЦАК. (Наш кар.). Пераход на спараную язду даў значнае паляпшэньне паравознай гаспадаркі. Паравозы заўсёды ў належным парадку. Дробны рамонт выконваецца самімі паравозамі брыгадамі. На парады яўка сваячасовая. Падача паравозаў таксама адбываецца без спазьненьня. Адносіны да апалу і змазачных матар'ялаў значна больш беражлівыя, чым былі раней. Амаль няма выпадкаў псаваньня паравозаў у дарозе. Ліквідаваны таксама выпадкі абрываў цягнікоў.

Значна ўзмацнілася працоўная дысцыпліна ў дэпо. П'янка амаль зьнішчана.

Ёсьць яшчэ, праўда, і рад недахопаў у замацаваньні спаранай і забясьпячэньні найбольшага эфэкту аб ліквідацыі абязьлічкі.

З прычыны нізкай дысцыпліны дыспэтчарскага апарату, паравозы часта прастойваюць па 3-4 гадзіны, марна трацячы апалу. Ёсьць выпадкі, калі дыспэтчары несвачаюцца даюць прызначэньне цягніку і паравозныя брыгады на працягу некалькіх гадзін чакаюць нарады.

Ударніцтва і спаборніцтва ў дэпо не разгорнуты. Нават рад членаў партыі і кандыдатаў не ахоплены спаборніцтвам. Уліку спаборніцтва ў дэпо не наладжана. Вытворчыя нарады працуюць слаба. Масавая работа культае.

А. ШУСТРЫ.

Прарыў яшчэ не ліквідаваны

Ня гледзячы на тое, што за апошні час у рабоце Віцебскага вузла наглядаецца некаторы зрух, усё-ж тэмпы ліквідацыі прарыву застаюцца надзвычай нізкімі. Рух пасажырскіх цягнікоў, паводле раскладу, выконваецца толькі на 20,6 проц. і таварных на 29 проц. Ня выконваецца заданьне і па прабегу паравозаў: замест 191 клм. у дзень—выконваецца толькі 142. Процант хворых паравозаў ясьці яшчэ расьце: за дзьве дэкады красавіка ён дасягаў 35 проц. За 20 дзён красавіка паўторна раманцтавалася 60 паравозаў. Замест эканоміі апалу—ёсьць перапал. Вялікай перашкодай у барацьбе за выкананьне транспэ фінпляну зьяўляецца тое, што да гэтага часу вымяральнікі не даведзены да рабочага. Надзвычай нізкая працоўная дысцыпліна на вузле. Прагулы павялічваюцца.

Дрэнна пастаўлена ажыцьцяўленьне рабочых прапаноў: з 300 рабочых прапаноў, якія паступілі ў першым квартале, праведзена ў жыцьцё 112, пры чым эфэкт ад ажыцьцяўленьня іх ня ўлічваецца. Асабліва дрэнна пастаўлена ажыцьцяўленьне рабочых прапаноў ў Віцебскім дэпо, дзе нядаўна спойдзена 32 надзвычай каштоўных прапановы рабочых, аб якіх нават ніхто ня ведаў.

Кіраўніцтва сацыялістычным спаборніцтвам не наладжана. З 10.000 рабочых спаборніцтвам ахоплена 4431 чалавек.

Арк. Зарубежны.

Па Савецкай Беларусі

Тав. Гей--у Жлобінскім раёне

ЖЛОБІН. (Наш кар.).

Нядаўна ў Жлобін прыехаў сакратар ЦК КП(б)Б тав. Гей.

Тав Гей пабываў у саўгасе Пірэвічы, у Стара-Руднянскім і Пірэвіцкім сельсаветах, дзе знаёміўся з работай сельсаветаў, правядзеньнем веснавой пасеўнай кампаніі, з работай калгасаў Імя Леніна, Будзённага і Чырвоная Рудня.

У часе знаходжаньня ў Жлобіне тав. Гей наведаў чыгуначны вузел, дзе знаёміўся са становішчам сацспаборніцтва і ўдарніцтва на вузле, з выкананьнем вымяральнікаў. У дэпо станцыі Жлобін адбыўся мітынг, на якім рабочыя выступалі з рапартамі аб выкананьні трансфінпляну. Ударнікі-чыгуначнікі ўзялі на сябе абавязацельства на працягу 5 дзён адрэмантаваць адзін паравоз і два вагоны. Кацельная брыгада высунула сустрэчны плян выкананьня вымяральнікаў. У сваёй прамове на мітынгу тав. Гей ахарактарызаваў задачы ўздараўленьня чыгуначнага транспэрту.

Конкурс на лепшы калгас

КРЫЧАЎ. (Наш кар.). Бюро крычаўскага райкому вызначыла тры пераходныя сьцягі і тры премії ў 600, 500 і 300 руб. лепшым калгасам, якія выканаюць інтэрвыкананьне плянаў пасеўкампаніі. Для выдачы прэмій вылучана спэцыяльная камісія.

Патрабуем тэрміновага ўмяшаньня

РЭЧЫЦА. (ПА ТЭЛЕГРАФУ). НА ШМАТЛІКІЯ ПАТРАВАВАНЬНІ АБ ВЫСЫЛЦЫ ІНЖЫНЭРА ДЛЯ УСТАНОЎКІ САМАТАСУ, РАЗМЫТАГА ПАНОЎКІ САМАТАСУ, ПАВОДКАЙ, ЛЕСВЕЛ НЕ АДКАЗВАЕ. ЗАВОДУ ПАГРАЖАЕ СПЫНЕНЬНЕ СЫРЦУ З РАКІ. ТРЭБА ПРЫНЯЦЬ ПАПЯРЭДЗІЦЬ ЗРЫЎ ПРАМФІНІЛЯНУ. ПАТРАВУЕМ УМЯШАНЬНЯ РСІ І ЗЬВЯЗДЫ».

БЮРО ПАРТКАЛЕКТЫВУ І ЗАВОДАКІРАЎНІЦТВА ЛЕСАЗАВОДУ ІМЯ ТОМСКАГА.

Выпуск Горацкага рабфаку

ГОРКІ. (Наш кар.) Адбыўся выпуск Горацкага рабфаку. У сувязі з выпускам, гаварову рабфакавец тав. Галадзед прыслаў наступную тэлеграму:

«Віншую вас, таварышы, са сканчэньнем курсу. Вы былі ударнікамі на вучобе ў рабфаку, спадзяюся, што вы застанецеся ўдарнікамі і ў ВНУ, і на сацыялістычнай будоўлі. Камуністычная партыйная патрабуе ад усіх нас аўладаць тэхнікай. Гэта задача стаіць перад вамі ва ўвесь рост. Ваша група выпускнікоў павінна зьявіцца ўдарнай калёнай арміі пралетарскіх спэцыялістаў».

Лес ідзе

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). Першым сплавам прыбылі ў Гомель два караваны з экспартным лесам і запалкавай асінай. Экспартны лес накіраваны для расьпілоўкі на завод «Калпраца», асіна паступіла на фабрыку «Вэзуві».

Ігнаруюць пастановы камісій па чыстцы

БРАГІН. (Наш кар.). Брагінская РККРСІ праверыла, як выконваюцца пастановы камісій па чыстцы савецкага апарату. Праверка выявіла, што ўстановы не рэалізавалі пастаноў камісій па чыстцы: няма сьпісаў вычышчаных і атрымаўшых спагнаньні; нідзе ня знойдзены прапановы камісій па паляпшэньні работы апарату. У спажыватарыстве на пасадзе загадчыка гаспадаркі служыць Грабштэйн, былы гандляр, вычышчаны па 1-й катэгорыі. Там-жа працуе загатоўшчыкам Этлін, гандляр, вычышчаны па 2-й катэгорыі, пасаду загадчыка загатоўчага аддалу займае гандляр Бухман, пазбаўлены права голасу. У райкаапсаюзе працуе былы гандляр Расьнік, вычышчаны па 2-й катэгорыі.

М—т.

Бяспрытульны вучастак

РАГАЧОЎ. (Наш кар.). У Рагачоўскім будаўнічага сэзону не падрыхтаваны. Няма работніка, які-б адказваў за будаўніцтва. Вызначана пабудаваць... разным барак, коштам у 120.000 руб. ... пушчана на будаўніцтва толькі 20... руб. На сёнешні дзень няма каштарыса і плянаў пабудовы. На рамонт ... камунальных дамоў адпушчана 80... руб., але дагэтуль ня складены каштарысы і пляны. У бяспрытульным ... вішчы—пабудова ільнаапрацоўчага ... воду; невядома нават, каму ён ... жыць.

Дагэтуль ня скончана пабудова ... —няма труб, дроту, не праведзен ... правод. Паводле першапачатковага каштарысу, будаўніцтва павінна ... каштаваць 60.000 руб., потым сэкуму ... вялічылі да 80.000, пасьля да 160.000 руб. Зараз аказалася, што на пабудову ... лазьні патрэбна 160.000 руб.

Брыгада рабкораў.

С.-г. каапэрацыя працуе дрэнна

МЕЖЫНА. (Наш кар.). Ніякага зрыву ў рабоце сельска-гаспадарчай каапэрацыі па Межынскім раёне няма. Працуе ... ужо больш году з моманту ... нізацыі, а нізавая вытворча-пасьлядоўная сетка с.-г. каапэрацыі яшчэ не афармована. Машынныя, малочныя і ... цыйныя таварыствы працуюць без ... раўніцтва. Яны ня лічацца нават ... шчыкамі райкапапаводсаюзу. Мабілізацыя сродкаў праходзіць выключна дрэнна. За некалькі месяцаў не сабрана ні аднэй капейкі паявых узносаў. Ніякай падрыхтоўкі да веснавой пасеўнай кампаніі райкаапсаюз не пракі... Нізавая сетка яшчэ ня выпрацавала плянаў кантрактацыі. На складах ... жаць тры вагоны ільнанасеньня і ... сельска-гаспадарчых машын, якія не рэалізуюцца.

Кіруючыя арганізацыі раёну ... зацікавіцца работай сельска-гаспадарчай каапэрацыі.

МЕЖАНЕЦ.

Зрываюць выкананьне абкладаньня

СЛУЦАК. (Наш кар.). Слуцкі ... выканаў за красавік толькі 10,4 проц. пляну мабілізацыі сродкаў насельніцтва. Бокшыцкі, Дарашынскі і Чарнавецкі сельсаветы не спагналі з кулакоў ... 4.000 руб. адпаразовага збору.

Тэмпы мабілізацыі сродкаў сьведчаць аб яўнай апартуністычнай недаацэнцы фінансавай работы.

МЕНСК

Забясьпечыць будаўніцтва водаправоду ў Навінках

Існуючы менскі водаправод, пабудаваны 50 год назад, не адпавядае свайму прызначэньню. Становішча з забясьпячэньнем гораду вадой пагаршаецца з кожным годам, а з разгортваньнем будаўнічага сэзону і ў летні час існуючы водаправод можа забясьпечыць горад вадой толькі на 60-65 проц. патрэбы. Такое становішча трэба лічыць пагражаючым і ў адносінах пажарнай аховы гораду.

Гарсавет прапанаваў Эльводу пабудаваць помпавую станцыю ў Навінках. Навінскі водаправод зможа забясьпечыць горад добраякаснай вадой аж да 1950 году. Зараз Эльвод праводзіць работы па бурэньні эксплёатацыйных шчылін, а таксама вядзе падрыхтоўчыя да пабудовы помпавай станцыі. Тэрмін канчатковай пабудовы і пуску станцыі ў эксплёатацыю—студзень 1932 года. Заяўкі на патрэбныя матар'ялы — трубы, жалеза, сьвінец—даны своячасова, але дагэтуль невядома ці будуць яны атрыманы. З-за адсутнасьці матар'ялаў ... зрываецца будаўніцтва станцыі. Аб ... тым пісалася ў друку, але вынікі ... нуль што няма.

Трэба рашуча паставіць пытаньне ... рад гарсаветам аб забясьпячэньні будаўніцтва станцыі патрэбнымі матар'ялам.

Бядрэдакц.

У фонд дапамогі пацярпеўшым ад зямлятрасеньня

— Група студэнтаў БЕЛАРУСКАГА ХЭМІКА-ТЭХНАЛЁГІЧНАГА ІНСТЫТУТУ, якая праходзіць вытворчае навучаньне на ГУЦЕ «КАСТРЫЧНІК», унесла ў карысьць пацярпеўшых ад зямлятрасеньня ў Савецкай Арменіі 32 р. і выклікала студэнтаў іншых груп, якія працуюць на заводах «Гэрой Працы», «Спартак», «Беларусь».

— Студэнты і супрацоўнікі РАБФАКУ БХТІ ўнесьлі ў фонд дапамогі пацярпеўшым ад зямлятрасеньня 130 руб.

Новы рэдактар газэты „Калгасьнік Беларусі"

Паводле пастановы ЦК КП(б)Б, адказным рэдактарам газэты «Калгасьнік Беларусі» зацьверджаны б. нам. Наркам'юсту БССР—тав. Н. Міхайлаў.

Дапаможам дзецям пацярпеўшых ад паводкі

Нябывалая ва ўмовах БССР паводка нанесла шмат матар'яльных страт ... сельніцтву. Весткі, якія паступаюць ... месц, гавораць аб неабходнасьці ... новай матар'яльнай дапамогі дзецям ... пацярпеўшых ад паводкі раёнах.

Цэнтральная камісія дапамогі ... пры ЦВК БССР вылучыла ў цэнтральны фонд дапамогі дзецям пацярпеўшым ад паводкі грамадзян 20 тыс. руб., ... гэтай сумы мала. Неабходна шырэй ... дапамога з боку грамадзкіх арганізацый ... на месцах, і ў першую чаргу з боку ... варыстваў «Прыхільнік Дзіцей». ...

Цэнтральная камісія зьвярнулася ... райвыканкомаў, гарсаветаў і таварыстваў «Прыхільнік Дзіцей» з прапановай прыняць меры арганізаванай дапамогі дзецям пацярпеўшых ад паводкі.

З залі пасяджэньня

На вячэрнім пасяджэньні 14-га з дакладам па творчым пытаньні (аб мастацкай прозе БелАПП'у) выступіў тав. Л. Бэндэ.

На прыкладзе твораў Міхася Лынькова, Платона Галавача, Андрэя Александровіча і некаторых іншых таварышоў дакладчык паказаў вялікія дасягненьні беларускай пралетарскай літаратуры. — Перамаганьне схематызму, залішняй публіцыстыкі, — гаворыць тав. Бэндэ, — паказ клясавых зрухаў унутры краіны ва ўсіх галінах будаўніцтва, глыбокі паказ сапраўды новага чалавека гэрэічнай эпохі будаўніцтва сацыялізму — вось нашы першачарговыя задачы.

Дакладчык спыняецца асобна на абходнасьці ўтварэньня арганізацыі ... вязі з рэвалюцыйнымі пісьменьнікамі Заходняй Беларусі, якія жывуць і ... цуюць у нячуванна цяжкіх умовах ... шысцкага тэрору.

14-га-ж дэлегаты пленуму кадэтскага ... на наведалі новую пастаноўку БДТ-2 «Качагары».

Паведамленьні

СЁНЬНЯ:

— У 18 гадзін, у Культпроце ЦК КП(б)Б, — нарада ўсіх таварышоў-камуністаў, якія працуюць у галіне дыялектычнага матар'ялізму і ленінізму (навуковыя працаўнікі і асьпіранты). На нараду павінны зьявіцца таксама камуністы — члены праўленьняў усіх марксыцкіх навуковых таварыстваў.

— Дом Комасьветы. У 19 гадзін — вечар для парт. і камсам. ячэек шэйнікаў (ф-к «Кастрычнік», імя 8-га сакавіка і імя Крупскай). Даклад «Выпікі выкананьня прэфінпляну гэтых прадпрыемстваў за першы квартал і ход выкананьня на другі квартал». Білеты па ячэйках КП(б)Б. У 19 гадзін, (пакой 23) — кансультацыя для прапагандыстаў першапачатковых школ «Партыя і барацьба за ленінскую лінію партыі». У 19 гадзін, (пакой 19) — групавая кансультацыя для вайсковых прапагандыстаў «Мэтодыка правядзеньня важнейшых запытаньняў у школах».

— У 19 гадз. Менскім гарпрафсавеце ... у клюбе імя Сталіна (рог Інтэрнацыональнай і Камсамольскай) склікаецца 1-я менская гарадзкая канфэрэнцыя ... рабочым шэфстве над вёскай. Прадпісана дня: 1) Задачы рабочага шэфства. 2) Выбары праўленьня і рэвіз. гарадзкога Мен. гар. шэф. таварыствам. ... Менскае гарадзкое фракцыі канфэрэнцыі ... ў 18 гадз.

— ЦК т-ва Чырвонага Крыжу БССР даводзіць да ведама ўсіх арганізацый ... ўстаноў, што ГРОШЫ, САБРАНЫЯ ... КАРЫСЬЦЬ ПАЦЯРПЕЎШЫХ АД ЗЯМЛЯТРАСЕНЬНЯ, з прычыны ... насьці хуткай дапамогі пацярпеўшым ... яны не павінны затрымліваць, а ... МІНОВА ПЕРАВОДЗІЦЬ НА РАХУНАК ЦК Чырвонага Крыжу БССР № 55-101 ... у Менскім Дзяржбанку.

Адказны рэдактар С. БУДЗІНСКІ.

Сёньня, *16 мая, у 7 гадз. веч., у памяшк. ЦК КП(б)Б, пакой № 11, адбудзецца*

пасяджэньне арганізацыйнай камісіі па скліканьні Ўсебеларускага зьезду рабселькораў.

На пасяджэньне павінны зьявіцца: т. т. Мітлін, Дунец, Красіна, Міляшкевіч, Вержбаловіч, Платаў, Шастакоў, Міхайлаў, Рагазінькава, Прынц, Чарнецкі, Герцман, Кочадзін, Дайн, Ізох, Гельфанд, Грынштэйн, Раманоўскі, Давыдава, Герчыкаў, Чарнякоў, Паўлоўскі. Просьба да ... т. т. зьявіцца без спазьненьня.

Сакратар аргкамісіі па скліканьні Ўсебеларускага зьезду рабселькораў ЗЭЛЬЦЭР.

„Чырв.Зорка" Пач. у 7; 8.45; 10.30 — З 15 мая новы фільм сэзону Экспанат з паноптыкуму. Зьвыш прагр.—хроніка саюзкіно № 20

„Культура" Пач. у 7; 8.45; 10.30 — З 15 мая новы фільм ДЖЫМ ШВАНТЭ. Зьвыш прагр. камэдыя Ромэя і Джульэта.

Інтэрнацыянал Пачат. 1 с. у 7 г. — З 14 МАЯ мастацкі фільм паводле апавяданьня ГОГАЛЯ САРАЧЫНСКІ КІРМАШ

„Пралетары" Пач. у 7 гадз. — З 15 мая нямецкі фільм ПРАБУДЖЭНЬ НЕ ЖАНЧЫНЫ. Драма ў 6 частк.

„Юны Піянэр" Пач. з 1 г. дня. — Эпізод з грамадзянскай вайны БУХТА СЬМЕРЦІ. драма ў 7 частках.

„СПАРТАК" Пач. у 6-30; 8; 9-40 11 Каса—з 5 гадз. — З 11-га мая выдатны фільм ПРАСТЫТУТКА. драма ў 7 частках.

16-га мая, а 18 гадзіне, адкрываецца ў памяшкань